Літаратурная Беларусь

Выпуск №8 (168) (жнівень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

Гэты выпуск — спецыяльны. Ён складзены ў асноўным з папярэдніх публікацый «новачаснай» «Літаратурнай Беларусі» і незалежнага часопіса «Дзеяслоў». Гэта творы, у якіх гучыць спрадвечнае жаданне беларусаў «людзьмі звацца», у якіх выказваецца аўтарскі боль за сучаснае і будучае сваёй Краіны, пратэст і нескароная вера ў перамогу Дабра і Волі.

У сённяшнія дні злачыннага ўладнага ліхалецця споведзі катаваных мірных грамадзянаў Беларусі шмат у чым пераўзыходзяць па сваёй шчырасці і трагічнасці многія мастацкія тэксты. Яны — таксама складнік сучаснага духоўнага скрыпторыя.

Беларуская літаратура заўсёды была і застаецца выразнікам нацыянальнай ідэі і дзяржаватворчасці. Але друкам і гумавым кулям яна можа супрацьпаставіць толькі пранікнёныя вершы, апавяданні, аповесці.

Мінаюць гады, дзесяцігоддзі, а яны, такія творы, на жаль, застаюцца актуальнымі...

Але Беларусь — жыве!

Час second-hand

(Канец чырвонага чалавека) Старонкі з кнігі





Святлана АЛЕКСІЕВІЧ

Мы развітваемся з савецкім часам. З тым нашым жыццём. Я спрабую шчыра выслухаць усіх удзельнікаў сацыялістычнай драмы...

У камунізму быў вар'яцкі план: перарабіць «старога» чалавека, стаpазапаветнага Адама. І гэта атрымалася... можа быць, адзінае, што атрымалася. За семдзясят з лішкам гадоў у лабараторыі марксізму-ленінізму вывелі асобны чалавечы тып — «homo soveticus». Адны лічаць, што гэта трагічны персанаж, іншыя называюць яго «саўком». Мне здаецца, я ведаю гэтага чалавека, ён мне добра знаёмы, я побач з ім, поплеч, пражыла шмат гадоў. Ён — гэта я.

Гэта мае знаёмыя, сябры, бацькі. Некалькі гадоў я ездзіла па ўсім былым Савецкім Саюзе, бо homo soveticus — гэта не толькі рускія, але і беларусы, туркмены, украінцы, казахі... Цяпер мы жывем у розных дзяржавах, размаўляем на розных мовах, але нас ні з кім не зблытаеш. Пазнаеш адразу!

Усе мы, людзі з сацыялізму, падобныя і не падобныя да астатніх людзей — у нас свой слоўнік, свае ўяўленні пра дабро і зло, пра герояў і пакутнікаў. У нас асаблівыя адносіны са смерцю. Пастаянна ў расповедах, якія я запісваю, рэжуць вуха словы: «страляць», «расстраляць», «ліквідаваць», «пусціць у расход» ці такія савецкія варыянты знікнення, як: «арышт», «дзесяць гадо ў без права перапіскі», «эміграцыя». Колькі можа каштаваць чалавечае жыццё, калі мы памятаем, што нядаўна гінулі мільёны?

Мы поўныя нянавісці і забабонаў. Усё адтуль, дзе быў ГУЛАГ і страшная вайна. Калектывізацыя, раскулачванне, перасяленне народаў...

Бацька ўспамінаў, што ён асабіста ў камунізм паверыў пасля палёту Гагарына. Мы — першыя! Мы ўсё можам! Гэтак яны з мамай нас і выхоўвалі. Я была акцябронкам, насіла значык з кучаравым хлопчыкам, была піянеркай, камсамолкай. Расчараванне прыйшло пазней.

Пасля перабудовы ўсе чакалі, калі расчыняць архівы. Іх адкрылі. Мы зведалі гісторыю, якую ад нас хавалі...

Людзі чыталі газеты, часопісы і маўчалі. На іх абрынуўся непад'ёмны жах! Як з гэтым жыць? Многія сустрэлі праўду, як ворага. І свабоду таксама. «Мы не ведаем сваю краіну. Не ведаем, аб чым думае большасць людзей, мы іх бачым, сустракаем кожны дзень, але пра што яны думаюць, чаго хочуць, мы не ведаем. Але бярэм на сябе смеласць іх вучыць. Хутка пра ўсё даведаемся — і жахнёмся», — казаў адзін мой знаёмы, з якім мы часта сядзелі ў мяне на кухні. Я з ім спрачалася. Было гэта ў дзевяностаперышым годзе... Шчаслівы час! Мы верылі, што заўтра, літаральна заўтра пачнецца свабода. Пачнецца з нічога, з нашых жаданняў.

Бацькі ўжо няма. І я не магу дагаварыць з ім адну нашую размову... Ён сказаў, што ім паміраць на вайне было лягчэй, чым неабстраляным хлопчыкам, якія сёння гінуць у Чачні. У саракавыя — яны з пекла траплялі ў пекла. Перад вайной бацька вучыўся ў Мінску ў Інстытуце журналістыкі. Успамінаў, што калі яны вярталіся з канікулаў, часта ўжо не сустракалі ніводнага знаёмага выкладчыка, усе былі арыштаваныя. Яны не разумелі, што адбываецца, але было страшна. Страшна, як на вайне.

У мяне з бацькам было мала шчырых размоваў. Ён шкадаваў мяне. Ці я шкадавала яго? Мне цяжка адказаць на гэтае пытанне... Мы былі бязлітасныя да сваіх бацькоў. Нам здавалася, што свабода — гэта вельмі проста. Прайшло трохі часу, і мы самі сагнуліся пад яе цяжарам, бо ніхто не вучыў нас свабодзе. Вучылі толькі, як паміраць за свабоду.

Вось яна — свабода! Ці такую мы яе чакалі? Мы былі гатовыя памерці за свае ідэалы. Змагацца ў баі. А пачалося «чэхаўскае» жыццё. Без гісторыі. Разбурыліся ўсе каштоўнасці, акрамя каштоўнасці жыцця. Жыцця наогул. Новыя мары: пабудаваць дом, купіць добрую машыну, пасадзіць агрэст... Свабода аказалася рэабілітацыяй мяшчанства, звычайна замардаванага ў рускім жыцці. Свабодай Яго Вялікасці Спажывання. Велічы цемры. Цемры жаданняў, інстынктаў — патаемнага чалавечага жыцця, пра якое мы мелі прыблізнае ўяўленне. Усю гісторыю выжывалі, а не жылі. А цяпер ваенны досвед ужо не патрэбны, на яго варта было забыцца. Тысячы новых эмоцый, станаў, рэакцый... Нейк раптам усё вакол стала іншым: шыльды, рэчы, грошы, сцяг... І сам чалавек. Ён стаў больш каляровым, асобным, маналіт узарвалі, і жыццё рассыпалася на выспачкі, атамы, ячэйкі. Як у Даля: свабода-воля... волечка-раздолечка... абшар. Вялікае зло ператварылася ў далёкую легенду, у палітычны дэтэктыў. Ніхто ўжо не казаў пра ідэю, казалі пра крэдыты, адсоткі, вэкселі, грошы не зараблялі, а «рабілі», «выйгравалі». Ці надоўга гэта? «Няпраўда грошай у рускай душы невытручальная», — пісала Цвятаева. Але быццам ажылі і разгульваюць па нашых вуліцах героі Астроўскага і Салтыкова-Шчадрына.

Ва ўсіх, з кім сустракалася, я пыталася: «Што такое — свабода?» Бацькі і дзеці адказвалі па-рознаму. У тых, хто нарадзіўся ў СССР, і тых, хто нарадзіўся не ў СССР, няма агульнага досведу. Яны — людзі з розных планет.

Бацькі: свабода — адсутнасць страху; тры дні ў жніўні, калі мы перамаглі путч; чалавек, які выбірае ў краме са ста гатункаў каўбасы, вальнейшы, чым чалавек, які выбірае з дзесяці гатункаў; быць нябітым, неадхвастаным, але неадхвастаных пакаленняў нам ніколі не дачакацца; рускі чалавек не разумее свабоду, яму патрэбен каза́к і бізун.

Дзеці: свабода — каханне; унутраная свабода — абсалютная каштоўнасць; калі ты не баішся сваіх жаданняў; мець шмат грошай, тады ў цябе будзе ўсё; калі ты можаш жыць так, каб не задумвацца аб свабодзе. Свабода — гэта нармальна.

У грамадстве з'явіўся попыт на Савецкі Саюз. На культ Сталіна. Палова маладых людзей ад 19 да 30 гадоў лічыць Сталіна «найвялікшым палітычным дзеячам». У краіне, у якой Сталін знішчыў людзей не менш, чым Гітлер, новы культ Сталіна?! Зноў у модзе ўсё савецкае... На тэлебачанні дзясяткі перадачаў, а ў інтэрнэце дзясяткі «савецкіх» настальгічных сайтаў. У сталінскія лагеры — на Салаўкі, у Магадан вы можаце патрапіць турыстам. Рэклама абяцае, што для паўнаты адчуванняў вам выдадуць лагерныя адзенне, кірку. Пакажуць адрэстаўраваныя баракі. А ў канцы арганізуюць рыбалку...

У Расіі адраджаюцца старамодныя ідэі: аб вялікай імперыі, аб «жалезнай руцэ», «аб адмысловым рускім шляху»... Вярнулі савецкі гімн, ёсць камсамол, толькі ён называецца «Нашы», ёсць партыя ўлады, якая капіюе камуністычную партыю. У Прэзідэнта ўлада, як у Генеральнага сакратара. Абсалютная. Замест марксізму-ленінізму — праваслаўе...

Перад рэвалюцыяй сямнаццатага года Аляксандр Грын напісаў: «А будучыня нейк перастала стаяць на сваім месцы». Прайшло сто гадоў — і будучыня зноў не на сваім месцы. Настаў час second-hand.

Пераклад з рускай Валера Стралко

Крыж Акрэсціна

Кастусь РАМАНКЕВІЧ

Да мяне сёння ноччу прыйшоў Акрэсцін. Да гэтага я з ім знаёмы не быў, толькі прозвішча на слыху круцілася. Але вось прыйшоў, на канапку прысеў, сядзіць — як жывы. Геройская «Залатая Зорка» матава паблісквае, а ён кабінет мой разглядвае.

Раблю выгляд, што сплю, — і пачынаю ўзгадваць. Завуць, здаецца, Барыс, масквіч. Сталінскі сокал, ліха раздзіраў лютага ворага на сваім штурмавіку. За прыгожыя вочкі, «бабкі» ды выкананне падрадаў на будаўніцтва паўднёвых мастоў у той час яшчэ «Герояў» не давалі. Класна ваяваў гвардыі старшы лейтэнант, ды вось спатыкнулася франтавая ўдача шостага ліпеня сорак чацвёртага года недалёка ад Мінска. Барыс Сямёнавіч загінуў геройскай смерцю, накіраваўшы сваю ахопленую полымем машыну на скопішча тэхнікі і жывой сілы праціўніка, як пазначана ва ўзнагародным дакуменце. Бабах! І паляцела яго дваццаціаднагадовая несмяротная душа ў вечнае і бяздоннае сіняе неба, а прозвішча — у вечную памяць нашчадкаў і ў назву сквера, вуліцы і завулка беларускай сталіцы.

— Паслухай, — загаварыў мой незвычайны візіцёр, — прачынайся ўжо, пісьменнік, так і жыццё праспаць можна. Што, да цябе кожную ноч госці з таго свету прыходзяць? Прачынайся, дапамога патрэбная.

Я канчаткова агоўтаўся, праціраю зенкі, абдумваю, як сябе трэба паводзіць з такімі гасцямі. Па-першае, Герой, па-другое, як бы гэта выкрутліва выказацца, не зусім чалавек... Прызнаюся, заўсёды ніякавеў перад геройскай зоркай, а тут яшчэ і на грудзях тагасветнага, так бы мовіць, суб'екта. Ну, думаю, будзе што будзе: набраў поўныя лёгкія паветра і адказваю:

— Не зразумеў, якія праблемы? Ты ж герой! Цябе ж ушаноўваюць, магілка пашанотная — як мае быць, сквер, вуліцу і завулак у твой гонар назвалі, дзяжурныя кветкі ў траўні прыносяць...

— Эх, таварыш палкоўнік! Не грэе гэтакая пашана маю лётную душу. Я ўжо дакладна ведаю, што праблема мая ў будынку 36-А майго завулка. Як бы прозвішча маё з назвы адвесці?

— Цікавая ў цябе прапанова. Думаю, з гэтым пытаннем табе ў мэрыю трэба, яны там, здаецца, за пераназванні адказныя. А з чаго ты ўзяў, што ў гэтым прычына тваёго душэўнага неспакою?

— Мне мужыкі з пекла — мы з імі часам у адной сталоўцы харчуемся — казалі, што калі такое зрабіць, то раўнавага ўва мне можа наладзіцца. А яшчэ нашы ледзь не ў адзін голас цвердзяць, што страшнае гэтае месца для жывых людзей. Ды і мне самому неяк няёмка. Ледзь хто скажа, што я Акрэсцін, так дýшы суседнія папрыціхнуць адразу, — і бачком, бачком, ад мяне далей, быццам я да таго месца якое дачыненне маю, а многія і напраўду думаюць, што я ледзь не родапачынальнік яго. А я ні сном, ні духам, я ж лятун, чалавек неба і вораг фашызму!

— Так, сапраўды, — адказваю, — добрага мала. Шчыра скажу, у Мінску, ды і не толькі, прозвішча тваё кроў марозіць.

— Вось і я аб тым. Пайшоў па сябрах, па начальству, да самога Ключніка Пятра дайшоў. Ён паслухаў, паціху чухае, тэлефануе кудысьці, а потым і выдае: маўляў, у нас па табе поўны ажур, зямныя нешта там, як заўсёды, накасячылі. Ляці ты, брат, на месца пахаванне, там хутчэй праўду адшукаеш. Словам, не той завулак табой назвалі, дакладней, няправільны будынак там узвялі, не па тваім лётным ведамстве.

— А што ж гэта за будынак такі? — у Апостала пытаюся. — Там, унізе, усе дамы для жыцця і працы будаваліся, наколькі я памятаю.

— Яно то так, — адказвае Пётр, — але часам з таго будынка да нас даўжэзная чарга стаіць, толькі брамку паспявай адчыняць. Так што ляці, шукай там народ з жывых, хто зможа дапамагчы саскрэбці тваё імя з крывавай сцяны. А можа, хто з іх і іншае што падкажа. Дык вось я, Мікалаевіч, што называецца, і дэсантаваўся. І тут, сярод вас, блукаю.

— І дзе ж вы ўжо пабывалі, Барыс Сямёнавіч?

— Ды які я Сямёнавіч? Малады яшчэ, маладым, як вядома, паміраць не страшна, а душы не старэюць, па сабе ведаю. Дзе быў? Дык я як даведаўся, што там турма, наўпрост туды. Лепш бы вочы мае невідушчыя гэта і не бачылі. Нампаліты ды тыя, каго з палону на фронт пусцілі, а не ў нашыя лагеры дагнівець адправілі, расказвалі пра зверствы нацыстаў і паліцаяў. Мы слухалі, ды не асабліва верылі, а тут сам сведкам стаў. Так што давялося наглядзецца, што там з народам твораць, валасы бесцялесныя на галаве варушыліся. І форма не нашая, і морды пад маскамі, а галоўнае — лупцуюць з зухаватасцю, з азартам, з мацюкамі і смехам. Напачатку думаў: можа, ворагаў дапытваюць, а прыгледзеўся — не, так, сабе ў ахвоту і, відаць, па волі ці па бязволлі начальства. Там і дзеці былі, і хлапчукі, і дзяўчаты, дык і іх таксама — гумовымі дручкамі, толькі косткі кволенькія трашчаць. Не дай табе Бог такога ўбачыць! Я і цяпер як успомню, дык дрыжыкі бяруць. І шмат, ой шмат там пабітых было. Гэта ж я на зямлю акурат ноччу дзясятага жніўня заявіўся. Кананада тады над цэнтрам горада стаяла, аж вокны дрыжэлі. Я ўжо грэшным чынам падумаў, ці не вярнуліся фашысты ў Мінск, ці які дэсант карнікаў высадзіўся. Палётаў там над Свіслаччу, добра, што бесцялесны, а то б збілі нахрэн у другі раз. Дзіка мне было, ці за тое мы ваявалі, ці за тое гінулі ў свае маладыя гады, каб беларусы беларусаў, як гестапаўцы, палкамі білі, газамі труцілі ды гумовымі кулямі адстрэльвалі. Журботна мне, Мікалаіч, стала. Дадому, на той свет захацелася, адно ўтрымала: Пётр другі раз брамку не адчыніць і сюды больш не пусціць, і застануся да другога прышэсця з чужым таўром Каіна. Дык вось, рабіць няма чаго, і паляцеў я ўжо на гэтым свеце праўды па начальству шукаць. Спачатку падаўся ў Жоўты дом, па старшынстве, значыць. НКВД у такіх справах заўсёды галава.

— Ну гэтыя ж пры чым? — спрабую запярэчыць, аказваецца, дýшы — народ зацяты.

— Ты, кажаш, пры чым? Ды пры ўсім. У нас там Судаплатаў з Бабковым такія пазнавальныя лекцыі ў нядзелі закочваюць, што ажно анёлы з чарцямі вылазяць са сваіх непрымірымых зонаў паслухаць. Але самае пацешнае, калі Мюлер з Андропавым сабачыцца пачынаюць. Тут ужо ўсе ўсё кідаюць — і на майдан.

— Пачакай, і ў вас там майдан маецца? — шчыра здзіўляюся я.

— А як без майдана? Гэта ж плошча паміж Раем і Пеклам. На ёй па святых днях вельмі вялікія начальніцкія душы, не на ўзор вашых, выступаюць. Карацей, не перапыняй мяне. Прылятаю ў Жоўты дом і адразу да галоўнага, а таго няма, на дакладзе, кажуць. Я да намесніка — ад варот паварот, дзверы зачыненыя. Усе на «палетках». Адшукаў я нейкага палкоўніка, пытаюся пра сваю бяду. Той і слухаць не хоча, маўляў, я ні я і хата не мая. А сам цішком запросік у архіў, ці не стукачок я. А што — не дрэнна ж на тым свеце сексотаў мець і начальству адрапартаваць аб аднаўленай вярбоўцы. Аднак і мы не лыкам шытыя! Душа — яна і ў Афрыцы душа, і бачыць усё, і чуе, і ведае, што будзе, і подумкі людскія чытае спакойна. Кажу свайму суразмоўцу: «Супакойся».

Асабісцік у нас добры быў, мы яго як на салдацікі з хлебарэзкі ў афіцэрскай сталоўцы злавілі, дык ён толькі пад нашу дыктоўку даносы пісаў. Потым, малайчына, выправіўся, дзяўчыну завёў з медсанбата. Загінуў, шкада, пры налёце на аэрадром. Дык што, не дапаможаш, пытаю ў яго. Не, гаворыць, не магу, ідзі да Чорнага, гэта яго зона адказнасці. Дзякуй, кажу, на добрым слове. Толькі ты хоць бойню на вуліцах спыні. А ён зноў рукі разводзіць: не магу, не мая епархія. Тут вышэй звяртацца трэба. Мы што... мы замуцілі, усё што трэба заплялі, страху на ворага нагналі, а ворагі — яны ж ёсць заўсёды і ўсюды, на Захадзе і на Усходзе. Калі дзе й няма, дык мы іх ураз выявім. Ёсць у нас і такія клоўны. Агентуру і даверaных асобаў паднялі ў масы, а самі вось сядзім, назіраем, сігналізуючы, што ды як. Ты хоць ведаеш, як нашая старая эмблема расшыфроўваецца?

— Не, — адказваю, — я ж з першага дня толькі «крылцы» насіў.

— Эх ты, душа твая матерная. «Сядзі ў кустах і чакай героя»!

— Хацеў я было запярэчыць, што за кусты сцэнку хутчэй даюць, а не героя, але з прыкрасцю махнуў рукой і падаўся да Чорнага. Аказалася, што той не толькі душой чорны, але яшчэ і не надта разумны. У яго на той момант быў адзін клопат: дзе і чаго ўзяць, якой бадзягі, каб сінякі з пабітых змыць. Якім пластылінам дзіркі ў целах пакалечаных заткнуць. Нават вунь спрабавалі Хрыста вы́клікаць, каб трохдзённых уваскрасіў. Яны завуць, а Гасподзь не ідзе. Не Божая гэта справа. А Нячысцік — тут як тут, так і круціцца, ды і давай яму нашэптваць, маўляў, закапай, закапай іх, Чарнушка, ці спалі ў крэматоры, а то знойдуць забітых — віску грамадскага будзе, як пры стрыжцы свіней, а то глядзі і з крэсла скінуць. А генерал, па тупасці сваёй, пачаў самому Чорту агрызацца. Гляджу я, зусім мянты ў вас страх страцілі і барзатой парaслі.

— Не бойся, Чарціла, — рыкнуў галоўны па дручках, — пакуль Сам на месцы сядзіць, мяне нікуды не папруць. А ён яшчэ сядзець доўга будзе, яго ўсходнія браты ніколі не здадуць, ён дзеліцца. Эх ты, рагаты! Адышоў бы лепш, тут і без тваёй серы дыхаць няма чым. Ты нават і ўявіць не можаш, як цяжка Яму народ газам паліваць, сам дні тры чыхае, і вочы слязяцца. А гумовымі кулямі ці проста расстрэльваць? У іншым выпадку раз па пяць паліць даводзілася, пакуль якую пігаліцу з коскамі зваліш. Байцам жа за сябе соромна. Што — яны лохі якія? Ды і плячо ад аддачы баліць.

— Бачу, кашы з ім не зварыш, — працягвае лётчык-герой Акрэсцін. — А за такія размовы з Вельзевулам гарэць яму са сваімі змоўшчыкамі ў вечным агні, ды і тым, хто побач стаяў, не паздаровіцца. Павярнуўся я і скразануў на самы рэспубліканскі верх, абмінаючы народных абраннікаў. Ды і якія яны абраннікі, так, канкурсанты. У райвыканкаме конкурс выйгралі, пайшлі ў вобласць, вобласць праскочылі — спісы на вуліцу Карла Маркса, там іх прамікраскапілі, Галоўнаму прынеслі, той асабіста з лупай прагледзеў, зацвердзіў, — можна і ў бюлетэні, і на галасаванне. Вось так і выбіраліся... Ну, Мікалаевіч, я табе скажу, патуляўся я, пакуль усе афіцыйныя рэзідэнцыі абляўтаў, адразу відаць, вельмі сціпла ў вас жывуць, так бы мовіць, кроў з крыві ад свайго народа, што як пацукі разбягаецца. Словам, апынуўся, у рэшце рэшт, у галоўным даміўшчы, на палац усекітайскіх сходаў падобны. Там зусім спалохаўся: дзе тут чалавека адшукаеш, тут знішчальны полк схаваць можна. Гляджу, а мне насустрач Берыя з Цанавам ідуць. Я ў струнку і зацiх. Міма прайшлі, нават брывамі не павялі. Ну, думаю, цьфу-цьфу. Ажно не, маршал спыніўся, павярнуўся, пенснэ блiснула, — і пытаецца:

— А чаго эта ты, старлей, тут ходыш, што, таго свэта мала?

— Аніяк не, Лаўрэнцій Паўлавіч, мне той свет мілы і прыемны, нашмат лепш, чым тут. Я па дазволу галоўнага Ключніка, «касяк» зямны трэба выправіць, Галоўнага Тутэйшага шукаю.

— Ох, братэц, хрэн ты яго найдзёш. За трое сутак мі не знайшлы. Справа ў нас сэр'ёзная, сам Сталін да нэго паслаў. Знаеш, Лэнін сэр'ёзна болэн, Іосіф Вэсарыонавіч на всэм хозайствэ, сваіх збырае. Даручэнне Тутэйшаму павінны былі пэрэдаць, але так і нэ знайшлы его. Што дакладываць будэм, нэ знаю. Зашылся он нэдзе, не выходыт. Дэло швах. Што за чэлавек, гастэй развэ так встрэчают? — павярнуўся і пайшоў. Цанава яму давай нешта нашэптваць на вуха. Берыя яшчэ раз спыніўся і павярнуўся. — А што ў тэбя за пытанне, гэрой? Можа, мі паможэм?

— Напраўду, Мікалаевіч, я ўзрадаваўся, коратка ўсё выклаў, стаю і чакаю. Яны падышлі бліжэй, параіліся і пачалі разважаць.

— Вы маеце рацыю, таварыш маршал, тое месца лепш так назваць, аднак Фелікс Эдмундавіч мяняцца не стане, заўпарціцца. Потым, зноў-такі, праспект мінскі ці на завулак — няроўны абмен. Там яшчэ Жукава праспект ёсць, але гэты лейтэнанта і ва ўпор бачыць адмовіцца. Ды і да вас яго стаўленне якое — самі ведаеце. Тут штосьці іншае трэба.

— Ну так думай, думай, Лаўрэнцій Фаміч. Нада жэ чэлавэку памоч. А можа, гэты пэрэулак твоім імэнэм назваць? Памятаецца, вы тут з Панамарэнкам нэ дрэнна папрацавалі.

— Не, мной назваць пабаяцца. Скажуць, з завулка Цанавы пачнецe, а плошчай Берыі скончыце.

— Катэгарычэскі нэт, плошчай імэні таварыша Сталіна. Але не пра нас рэч.

— Так-так. Я, Лаўрэнцій Паўлавіч, думаю, трэба пакінуць рашэнне гэтага пытання на сумленні саміх гараджан.

— Як эта?

— Хай збяруць подпісы пад петыцыяй і запатрабуюць рэабілітаваць сумленнае імя баявога лётчыка, ачысціць, так бы мовіць, героя ад брыдоты катаванняў і здзекаў. А завулак з домам 36-А перайменуюць. Хай яго назавуць імем якога-небудзь заўзятага нягодніка, скажам, з МУС, або завулак Катавальны, а можа, імя АМАПу, таксама добра гучыць. Але мне асабіста Катавальны вельмі падабаецца. Я гэты дом і завулак добра памятаю, там яшчэ мае́, заплечных спраў майстры, пачыналі працаваць. Тады таксама, таварыш наркам, калі памятаеце, у аснoўным бязвінных плюшчылі. Не думаў, што нашыя традыцыі на гэтай зямлі, а галоўнае, у мазгах кіраўніцтва так моцна прыжывуцца.

— Так што, гэрой, всэ твае на тэбэ. Шукай, хто эта завострыць, шум, можэт, падымэт. Сам думай, а вэрнэшся, прыхады, віна харошэго вып'ем, пагаварым. — І, ляпаўшы сваёй спадарожніка па плячы, міралюбна дадаў: — Пайшлі, Цанава, а то апяць да раніцы пад варотамі стаяць будзем.

— Дык вось яно і рашэнне, — узрадаваўся я і сарваўся з ложка, — ка́ты табе яго, дарагі візіцёр, і падказалі, ці трэба было з-за гэтага на грэшную зямлю перціся, яшчэ якую заразу на той свет прыцягнеш?

— Падказалі то падказалі, але ж я да Шчорса сам не пайду за сябе прашэнне пісаць. Не па-афіцэрску, ды і пісаць няма рук.

— Там ужо Шчорса няма, там Сіўлак пануе. Дык мне што — ад сябе па гэтым пытанні на імя мэра паперу напісаць? Аднак, думаю, не паверыць, што мы з табой вось так папросту размаўлялі...

— Ды не, заяву пісаць не трэба. Ты аповед напішы, ты ж пісьменнік, апублікуй яго, а народ, калі памяць у ім пра герояў жывая, няхай сам і вырашае, як і што рабіць. Навошта яму чужое дзярмо на маіх пагонах. Ну дык як — напішаш?

— Напішу, — адказаў я і прачнуўся. У пакоі цішыня, гадзіннік цікае, лёгкі пах авіяцыйнай газы ледзь казыча ноздры, — і толькі на душы чамусьці трывожна.

Прыпавесці



Васіль БЫКАЎ



Фота www.pixabay.com

ГЕРОЙ

Племя тэрарызаваў Дракон.

Дзе ён жыў-пасяляўся, ніхто не ведаў, — можа, дзе блізка, а можа далёка, можа, не на зямлі нават. Але ён дапякаў племю штогод. То хапаў у полі маладых дзяўчатаў, а то і хлопцаў, то дашчэнту вытоптваў пасевы, то бурыў халупы. А то насылаў на племя свой драконаўскі мор, калі ў полі не вырастала нічога, і племя трывала люты голад. Як было бараніцца ад таго зверыядаўца, ніхто не ведаў. Праўда, здавён часу было заведзена ахвяраваць. У пэўны вясновы дзень, як пачыналі сачыцца маладым сокам бярозы, старэйшыны родаў збіраліся ля трох камянёў на Дубовым капішчы і выбіралі Героя. Ахвярай яго не называлі, тое не было прынята, называлі ласкава і спаважліва Героем. Героя пасылалі ў ахвяру Дракону, які затым, і праўда, прыціхаў на колькі часу, пераставаў назаляць племю. На палёх спеў ураджай маісу і кукурузы, сыцеў статак. Дый хваробы быццам адкараскваліся ад людзей. Але толькі на пэўны нядоўгі час. Між тым племя шанавала чарговага Героя-ахвяру. На капішчы яму ладзілі помнік — высока пілавалі самы тоўсты дуб і з таго мажнага пня высякалі чалавечую выяву. То была складаная праца, і давяралі яе самым майстравітым людзям, самым шчырым і адданым вернікам. Такіх пнёў-ідалаў на капішчы за гады набралася ўжо некалькі тузінаў, усе ссечаныя дубы, груба, але выразна аздобленыя людскімі абліччамі. Яны ўважаліся за святых, дужа шанаваліся. У іхні гонар спраўлялі імшу — напачатку лета, па заканчэнні палявога сезону, пасярод зімы. Ім таксама ахвяравалі, але не мужчынаў, якіх у племені ўсё ж шанавалі за іх рабочыя рукі, а найбольш з дзяцей — хлопчыкаў ці дзяўчынак. Тых, каму карцела ахвяравацца, бо тое было прыгожа — з вянкамі на галоўках, пад радасныя спевы наўкола. Ахвотнікаў і ахвотніц было нямала, выбіралі самых прыгожых і беззаганных у паводзінах. А таксама ад лепшых бацькоў, горшыя таго не заслугоўвалі. Горшыя гаравалі пад драконаўскім прыгнётам — рабілі ў полі, пасвілі жывёлу, няньчылі малодшых. Абраныя разам з дымам узносіліся пад аблачыны, дзе было іншае, райскае жыццё. Разам з Героем іх таксама шанавалі шэраг наступных гадоў. Аж пакуль не з'яўляўся наступны Герой. Тады ўсё племя пераключалася на шанаванне таго, новага.

Хлопец Кім сапраўды быў самы дужы і, можа, самы смелы сярод немалой юначай грамады племя. І яшчэ ён дужа добра спяваў. Мабыць, менавіта таму, як з'явілася чарговая патрэба ахвяравання, выбар старэйшынаў патрапіў на яго. А патрэба сталася дужа пільная — ужо з вясны Дракон тройчы абрынаў свой гнеў супраць племя — найперш ушчэнт засушыў палеткі, пасля наслаў на іх град, і напаследак задушыў у ваколіцах трох маладых дзяўчатак. Старэйшыны меркавалі, што тое – не астатняе ў той год драконава злачынства, неўзабаве трэ чакаць новых. Бо ўжо другі год не ахвяравалі, не пасылалі да Дракона Героя.

Як сказалі Кіму, што сёлета ягоная чарга, хлопец узрадваўся гэткаму памяркоўнаму выбару. Тым болей, што ён ужо ведаў, з якога дуба будзе змайстраваны помнік яму — той самы высокі дуб ля скрыжавання дзвюх сцежак на капішчы быў бачны здалёк.

Праводзілі Героя ціхмяным летнім адвячоркам, як людзі папрыходзілі з поля. На капішчы расклалі вялікае вогнішча, наўкола якога сабралася ўсё племя. Галоўны і самы стары святар зычна пракрычаў заклінцы на чатыры бакі свету. Усе радаваліся, будучы ўпэўненыя, што ўжо цяпер Дракон надоўга ўціхамірыцца, а Кім шчасліва ўвасобіцца ў пашаноўнага дубовага Ідала. Радаваліся бацькі Кіма, яго два малодшыя браты, якім стала наканавана зрабіцца роднымі братамі Героя; яны таксама гатовыя былі ў свой час пераняць ягоны прыклад. Радавалася каханая дзяўчына Кіма. Хоць, вядома, росстань — справа нялёгкая, але ж то расстанне не абы з кім — з Героем! Толькі Кімава маці не адчула вялікай радасці, дык то ж — маці. Не надта свядомая, абцяжараная матчынымі забабонамі, яна была бясcільная перад самотай разлукі. Маці сама ад таго пакутвала, ды не магла перамагчы сябе.

Як змерклася, Кім узяў свой востры меч і, адышоўшы ад вогнішча, знік у цемрыве ночы.

Племя занялося спрадвечнымі, звыклымі для сябе справамі. Праз колькі дзён узялося ладзіць дуб-помнік. Тры майстры за тры дні ссеклі той самы высокі дуб, абсеклі голле і з вяршыні высокага камля пачалі высякаць знаёмыя рысы Героя. Атрымалася ўвогуле падобна да яго аздобы, хоць тое было і не абавязкова. Галоўнае, каб было мужна, гераічна і прыгожа. Але што да Кіма, дык тут нічога прыўкрашваць і не было патрэбы. Ідал-помнік атрымаўся выдатны. Ці не самы лепшы сярод усіх іншых — старых і нядаўніх, якія цесную купкай высіліся на капішчы. Найстарэйшыя з іх, праўда, паволі страчвалі сваё былое хараство, чарнелі, трэскаліся, некаторыя нават трухлелі. Але тое зразумела — ім даўно ўжо не ахвяравалі маладых і патроху забываліся на іх. Уся ўвага і любоў племя засяроджвалася на апошніх.

Апошняя ахвяра, здаецца, была прынятая Драконам (значыцца, Кім дагадзіў, выбар старэйшынаў быў правільны), напады на племя спыніліся. За паўгода не было ніводнага ўварвання, ніхто на полі не быў схоплены. Ураджай выспеў зусім неблагі. Увосень, як сабралі маіс і кукурузу, племя наладзіла ўрачысты фэст у гонар апошняй, гэткай здатнай ахвяры.

І раптам аднойчы на сконе дня ў паселішчы паявіўся Кім.

Быў ён схуднелы, абдзёрты, босы, але ўсё з тым жа мячом у похвах, які яму ўручылі старэйшыны, і паведаміў, што забіў Дракона.

Тое было нечакана, нечувана і збянтэжыла ўсіх. Племя не ведала, як да таго аднесціся — ніколі раней нічога падобнага ў іх не здаралася. Ніхто не шкадаваў Дракона, людзі гатовыя былі парадавацца з нечуванай нагоды. Але гэтая навіна бурыла ўсю іерархію, блытала гісторыю, пляжыла веру, заснаваную на пэўным суіснаванні са злой варожаю сілай. Забойства Дракона будзіла ў душах людзей нестрываны страх: як бы цяпер не стала горш. Калі і праўда Дракон апынуўся забітым, ці не навáляцца на племя новыя жахлівыя выпрабаванні якой іншай злой сілы?

Зноў жа — што рабіць цяпер з выдатна зладжаным і ўжо ўшанаваным чурбаном-помнікам?

Нечаканае вяртанне Кіма выклікала вялікую ўзрушанасць усяго племя, але найбольшую — сярод родзічаў і крэўных Героя. Маці спярша ўзрадвалася, а затым аж спалохалася тае свае радасці. Бацька схапіўся за галаву. Два браты Кіма адразу яго ўзненавідзелі — гэтак спляжыць усё сваё ды іхняе, вынашанае за год геройства! Каханая спахмурнела — яна адчула сябе ашуканай: каханак быў Героем, а стаў немаведама кім. Дні і ночы ён задуменна сядзеў у халупе, ні з кім не спатыкаўся, ранейшыя сябры пакінулі яго. Усе яго адцураліся. І нават Ідал-помнік без належнай ласкі і пашаны пачаў чарнець, трэскацца, яўна бурыцца. Таго, вядома, дапусціць было нельга.

Старэйшыны племя сабраліся ля трох камянёў на капішчы, вырашалі, як быць? Справа была сур'ёзная, трэба было прыняць неардынарнае вырашэнне. Належала выбраць адно з двух — ці Герой, ці ягоны помнік. Пасля нядоўгай дыскусіі вырашылі, што помнік усё ж даражэй. Ягонае захаванне не запатрабуе пераробкі іерархіі, не пабурыць традыцыяў. А Герой Кім? Героі яшчэ знойдуцца, калі будзе ў тым патрэба.

Герой Кім знік. Казалі, пайшоў у лес і не вярнуўся. Можа, утапіўся ў дрыгве, а можа, яго задралі звяры. Дракон жа таксама знік, падобна, сапраўды быў забіты, і пра яго паступова забыліся. Гэтаксама, як і пра Героя Кіма.

Дубы-ідалы не знікалі доўга, аднак шанавалі іх усё з меншым імпэтам. Мабыць, не было ў тым патрэбы.

А пасля перасталі і зусім.

ЧОРНАЯ СІЛА

Тады ў краіне панаваў тэрор. Шмат каго вешалі, ссылалі, расстрэльвалі. Бальшыню саджалі ў вязніцы. Каго на восем гадоў, каго на дзесяць ці дваццаць пяць. Тых, хто скардзіўся, плакаў ці ад болю крычаў на допытах, саджалі назаўжды. Іх плач-енк уважаўся за пратэст ці знявагу працавітых карных органаў. Карныя органы дужа пільнаваліся адмысловага гонару і не трывалі знявагі.

Усе арыштаваныя прызнаваліся ў чым хочаш. У чым іх змушалі прызнацца. Быццам хацелі знішчыць дыктатара, атруціць суседзяў, утапіць жонку і дзяцей. Тое выклікала здзіўленне на волі, дзе не маглі даўмецца, чаму яны так робяць. Але во тых, што нядаўна яшчэ прызнаваліся ў самым жахлівым, пачалі выпушчаць на волю. Тое таксама было загадкава і таямніча. Адзін толькі Упарты Маўклівец з паддашша ведаў, што то скончыўся чорны касмічны цыкл, калі магчыма было ўсё. Усё, што захоча чорная сіла, якая панавала ў космасе. А чорная сіла заўсёды хацела шмат — часам дзівоснага і неверагоднага.

Так і тады. Настала пара выпушчаць тых, што ацалелі ад тэрору. І яны вярталіся — састарэлыя і хворыя — да сваіх не менш састарэлых ды хворых жанок і дзяцей. А то й да бацькоў, калі бацькі дажылі да таго нечаканага вяртання. Цяпер яны ціха апавядалі паначы, што невінаватыя, што прызнацца іх змусілі. Бо білі, катавалі, казалі, быццам родзічы ад іх адмовіліся, а жонкі здрадзілі. Яны сапраўды гады гэтак думалі. Толькі Упарты Маўклівец ведаў, што пад арыштам яны думалі інакш. Хто раней, хто пазней — шматлікія з іх паверылі следчым, што вінаватыя, і павініліся ў тым. Зрабіць тое ад іх дамаглася чорная сіла, якая запанавала ў грамадстве, і чалавеку нічога болей не заставалася, як скарыцца і павініцца. Што яны і зрабілі. Пра ўсё тое Упарты Маўклівец занатаваў у свае тоўстыя кнігі.

Але во чорная сіла саступіла, даючы месца новай. Тады пачалі вінаваціць нядаўніх абвінаваўцаў, катаў ды суддзяў. Віна гэтых была ва ўсіх навідавоку, наконт іх ні ў кога не ўзнікала сумнення. Ды тыя і не ўпарціліся – адразу прызналіся ва ўсім: білі, судзілі, стралялі. Але ж — верылі! Верылі ў ідэю, якая на той час валодала ўсімі — і правымі, і вінаватымі. А вернік, як здаўна вядома, таксама чалавек зацяты і ўжо таму не можа быць вінаваты.

Новы суд тое апраўданне прызнаў слушным. Бо і суддзі таксама верылі ў сваю ідэю і не хацелі памыляцца. Упарты Маўклівец рэагаваў на ўсё з разуменнем, але і з трывогай. Чарговы касмічны цыкл сканчаўся, зачынаўся новы, значыць, належала чакаць змены. Толькі якой? Таго мудры Упарты Маўклівец яшчэ не ведаў.

Тым часам прадчуванне зменаў неслася ў паветры, гудзеў народ на вулках і ў крамах, дзе менела тавараў і раслі цэны. Дыктатар занепакоіўся і прыняў меры. Паколькі хлеба, масла і бензіну ён даць не мог, дык даў адмысловы ўказ пасадзіць і падсудных, і суддзяў, і правых, і вінаватых. Каб у адпаведнасці з папулярнай на Захадзе ідэяй дэмакратыі нікому не было крыўдна. Тысячы людзей селі ў вязніцы, яшчэ болей калонамі павалакліся на Поўнач, да вечнай мерзлаты, якая дужа спрыяла скарачэнню арыштанцкага кантынгенту. Адно было кепска, што ў вечнай мерзлаце не было як даць рады штабялям трупаў, і тыя ляжалі там, не гніючы. І закапаць іх не было як. А галоўнае — там побач адзін з адным ляжалі суддзі з падсуднымі, пракуроры з рэцыдывістамі, што, канешне ж, не лезла ні ў якія вароты. Ні савецкія, ні фашыстоўскія. Належала становішча выпраўляць.

Як памыляліся, так і выправілі: рашуча і хутка. На гэты раз арыштавалі ўсіх пракурораў, катаўнікоў і суддзяў, дзейнасцю якіх было дужа абуранае грамадства. Але толькі да той пары, як пачалі іх судзіць. Бо вядома ж, калі не вінаватыя ахвяры, дык, мабыць, вінаватыя іх кáты.

Працяг на стар. 10 (4) »



Малюнак www.eksmo.com

« Працяг.
Пачатак на стар. 9 (3)

Каты, аднак, ніколі не бываюць вінаватыя — таго чамусьці ніколі не ведалі людзі. Упарты Маўклівец, канешне ж, усё прадчуваў. Калі пачалі судзіць, усе, бы па камандзе, сказалі, што выконвалі загад. Не хацелі, а выконвалі; таму хай судзяць тых, хто аддаваў загады. Але ж тыя, хто аддаваў загады, не забілі нікога. Нават не кранулі пальцам — завошта ж было іх судзіць?

Мусіць, усё ж дыктатар ды яго памагатыя былі людзі разумныя. Яны хутка даўмеліся, што так можна дачакацца і якой неспадзёўкі. Таму найлепш, калі адказнасць за ўсё добрае і кепскае зрабіць калектыўнаю. Як і належыць — надаўшы дэмакратычныя формы Закону. Толькі тады льга будзе не турбавацца і спаць спакойна.

Заканадаўчы кангрэс склікалі дужа прадстаўнічы. Тысячы мужчынаў усіх узростаў сабраліся ў вялізнай спартовай залі. Спатрэбіўся прэзідыум, у які прыйшло некалькі сотняў, што шчыльнымі шэрагамі расселіся на сцэне. Упарты Маўклівец, зірнуўшы на іх, сціпла ўсміхнуўся: усё было зразумела. Ужо і ў прэзідыуме ім цесна, а як станецца ля карыта? Гэтым кормным парсюкам з неспатольным маладым апетытам не ўнікнуць бойкі. Значыць, доўга тое не праіснуе.

Быў прыняты строгі закон, які прадугледжваў усё. Цяпер караць належала адно вінаватых; невінаватых караць забаранялася. Хто вінаваты, а хто не — тое вырашаў суддзя са згоды начальства. Плакаць і ёнчыць у камерах дазвалялася колькі заўгодна, але не прасіць літасці. Літасць уважалася за найбольшае злачынства з боку суддзяў. Пратэставаць супраць мясцовага начальства дазвалялася толькі з яго пісьмовага дазволу і не бліжэй за пяць кіламетраў ад ягоных будынкаў. За дазвол на тое адказвалі ўсе інстанцыі, за забарону — ніхто. У тым палягаў галоўны выразнік новага, дэмакратычнага часу. Усё тое было новае і даволі загадкавае.

Увечары Упарты Маўклівец пагартаў на паддашшы свае тоўстыя кнігі і хутка натрапіў на пэўны адказ. Чорная касмічная сіла пакрысе саступала з неба, за ёй насоўвалася новая. Упарты Маўклівец ужо ведаў, што тыя чорныя хмары там не знікаюць ніколі. Ён хіба не здагадваўся, што генеруюцца яны зусім не ў космасе, а на зямлі. Толькі ўплываюць з космасу, куды па чарзе і вяртаюцца.

Такім чынам хмара прыходзіць і хмара зыходзіць, зрабіў няновую выснову Упарты Маўклівец і загарнуў сваю самую тоўстую кнігу.

ІНТЭГРАЦЫЯ

Рэшта незалежніцкага беларускага войска засяродзілася на хваёвым узлеску. Наперадзе ляжала летняя, у красках лугавіна з крывулястаю рэчкай пасярэдзіне. За ёй на палявых схілах стаіліся расейцы.

Беларусы трывалі паразу — не адну, а шэраг паразаў запар, і не дзіва. Ваяваць з кантрактнікамі, якім плацілі шалёныя грошы ў далярах, было няпроста. Асабліва, калі ў іхняй краіне на вайне толькі і магчыма было зарабіць. У беларусаў жа даляраў не было, — былі адны «зайцы». Зноў жа іхняя вайна падпала пад ранг тэрарыстычнай, і беларусы спадзяваліся хіба на ўласны патрыятызм і нацыянальную сведамасьць, якую горача прапагандаваў вернуты з-за рубяжа Зянон Спазьняк. Вярнуў яго Камандуючы, маршал, які ўзначаліў барацьбу за незалежнасць гэтак жа апантана, як нядаўна змагаўся з адыёзнай «самасційнасцю». Некаторыя здзіўляліся, а бальшыня ўбачыла ў той палітычнай змене чарговы хітраванскі выверт любімага кіраўніка.

Памятаючы першасную сяржанцкую вывучку ў войсках КДБ, Камандуючы патрабаваў безумоўнага выканання ягонага загаду перамагчы праклятых расейцаў, ды тое памагала мала. Мала памагалі і красамоўныя заклікі да таго Зянона Спазьняка, што дзеля незалежнасці Беларусі адрынуў усе ранейшыя крыўды на маршала і заўзята заклікаў следаваць святым запаветам адраджэння. Нядаўнія калгаснікі ды рабочыя «паштовых скрынкаў» слухалі, але слаба разумелі ніколі не чутыя каманды накшталт «зважай!», «шыхт», «вайсковы чын» або нават слова «жаўнеры». Мала што ў гэтым сэнсе мог растлумачыць і былы старшыня беларускага савету Сцяпан Парэцкі, якому дазволілі вярнуцца з Амерыкі і ўзначаліць адну з вайсковых калонаў. Гэты з-за рубяжа прывёз некалькі кнігаў па беларускай гісторыі, але Камандуючы загадаў выкінуць ягоную гісторыю ў прыбіральню — яму патрэбны былі жаўнеры. Галоўны наконт бяспекі генерал-пракурор Мэйман густа абклаў яго стукачамі з задачай: высвятліць, ці не зашыфравана ў кніжках старшыні якая адмысловая знявага гонару Камандуючага. (Наконт уласнага гонару той стаў надта чуйны.) Сам Мэйман, не зважаючы на дзівосныя зігзагі Камандуючага, захоўваў непахісную вернасць таму, што толькі і давала яму магчымасць захаваць жыццё. Шматлікія ягоныя таварышы ўжо даўно пáрылі зямлю, і ўсё праз тое, што мелі даўгія языкі. Мэйман жа з кароткім языком за рэкордна кароткі час стаў генерал-пракурорам і гатовы быў змагацца за незалежнасць Беларусі, як шэраг гадоў змагаўся супраць яе.

Калі з лесу на ўскраек падцягнуліся апошнія з вайскоўцаў, Камандуючы загадаў падпалкоўніку Старкевічу пастроіць усіх у шарэнгу. Набралася няшмат, — змораных, кульгавых, абдзёртых, параненых з акрываўленымі бінтамі на руках і галовах. Як «вечны падпалкоўнік» Старкевіч далажыў, Камандуючы выйшаў з шыкоўнага, ушчэнт запэцканага гразёй «Джыпу Чырокі» і сказаў прастуджаным ці прапітым голасам:

— Ну што? Прасралі Беларусь? Я ж казаў… Цяпер будзем страляцца. Бо калі вазьмуць расейцы, горш будзет. Як вучоны-гісторык я ведаю… Так што — хто першы?

Усё ж гэта былі свядомыя людзі, выхаваныя на гераічным досведзе вялікай вайны ды партызанскай літаратуры, і цяпер увесь шэраг зрабіў крок наперад.

— Ну зачэм жа так многа? — сказаў Камандуючы. — Уначале — аднаму, для прымеру. Дык хто? Ты — Спазьняк?

— За Беларусь заўсёды гатоў! Смерць маскалям! — мовіў схуднелы, у абвіслым шынялі былы старшыня БНФ-ХДС і дастаў з-за дзягі крамнёвы пісталет узору XVI стагоддзя. Сучасны АК ён прынцыпова не хацеў браць у рукі і, стрэліўшы сабе ў грудзі, бы жытні сноп, упаў пад ногі сябрам.

— Стойкі быў барэц за незалежнасць, — пасля паузы сумна сказаў Камандуючы. — Я ўважаў яго. Ну хто далей? На мяне не глядзіце, я буду апошні. Як капітан з тонучага судна. Ты — Парэцкі?

— Але я — легітымны старшыня…

— Мне напляваць і расцерці, што ты легітымны. Калі трусіш — паможам. Мэйман!

Мэйман, які з прычыны недахопу кадраў даўно быў пракурорам, суддзёй і «спалніцелем прыгавораў» у адной асобе, спрытна падскочыў да разгубленага Парэцкага і стрэліў у патыліцу.

— Хто яшчэ надта легітымны? — строга папытаўся Камандуючы. Мабыць, болей такіх не знайшлося, і Камандуючы холадна патлумачыў: —Наш прынцып ізвесны: дабравольна, но абязацільна. Усе, хто любіць Беларусь, далжны ахвяраваць для яе. Правільна, беларусы?

— Правільна! — згодна, хоць і не дужа гучна пранеслася над шэрагам.

— Я бароўся, усе бачылі. Бароўся, як звер. Сначала за інтэграцыю, патом за суверэннасць. Так вынуждалі абстаяцільствы. Але я не Бог, враг пабядзіў. Так што майце чэсць, беларусы.

З шэрагу выйшлі два невялічкія вайскоўцы ў запэцканым камуфляжы, з аўтаматамі Калашнікава на грудзях.

— Мы гатовы, — ціха сказаў адзін, і Камандуючы бліснуў хцівым позіркам.

— Даўно ты далжон быць гатовы, грамадзянін Залябедзька, — Я табе гаварыл: плоха кончыш. А ты столька цянул. На дружка раўнялся?

— Мы не раўняліся. Мы са спадаром Ранчоркам належалі да розных партыяў і рухаў.

— Рухаў! — перадражніў Камандуючы. — Во дарухаліся. Удвох асталіся.

Амаль разам бухнулі два стрэлы. Пасля строй зусім разбурыўся, некаторыя саступілі ўбок, пачулася яшчэ некалькі стрэлаў. На роснай траве паболела нерухомых целаў. Іх не крáталі, нікуды не прыбіралі. Нерашучыя стаялі з разгубленым выглядам. Перад невялічкаю купкай сваіх падначаленых Камандуючы аддаваў апошнія распараджэнні.

— І эта… Пагінем, дык нада, чтоб напісалі рэквіем. Перадайце мой указ Гучанку.

Гучанок даўно ў Маскве. Другую зорку на тратуары абмывае.

— Прадацель! А так на задніх лапках плясаў… — Вусаты твар Камандуючага зрабіўся зусім суровы і змрочны.

— Не трэба было яго пушчаць на Віцебскі базар. Хай бы сядзеў у Камаях, маліўся ды згарэў з уніятамі. Як Хадырка з Барадулям.

— А што — згарэлі? — з цікавасцю папытаўся Камандуючы.

— Да тла.

— Тым лепш. А то — месца на Усходніх могілках, пахараны… Гэтыя пахараны разарылі мне гасударства.

— Рынкавая эканоміка, — змрочна канстатаваў Мэйман. — Ні ў якое сравненіе з сацыялістычнай.

— Сацыялістычная таксама не аптымальная. Я ведаю, — асцярожна мовіў Старкевіч, апрануты ў шынель з пагонамі падпалкоўніка. — Як я камандваў ротай…

— Ты плоха камандваў, — адрэзаў Камандуючы. — І тады, і цяпер.

— А хто лепш? Я стараўся…

— Пастарайся ў пасдедні раз. Ну! Ці памагчы?

— Сам умею, — сказаў Старкевіч і адвярнуўся. Хутка бабахнуў пісталетны стрэл, і падпалкоўнік, сагнуўшыся, тыцнуўся галавой у траву.

— Во гэта іспалніцельнасць! І ні слова вапракі. Дажа на беларускай мове. На мове! — грэбліва мовіў Камандуючы. — Кстаці, а гдзе Білевіч? Наўрад ці застрэліўся. Гэты балабон-няўмека за што ні возмецца, усё праваліць. Столькі змагаўся за мову, і што? Нават трасянкі не дамогся. Гімна не склаў. Я яму даручыў гімн Камандуючага, чтобы он ваадушаўляў масы. Далжон он был пастарацца. Так нет. Сабатажнік он, ваш Білевіч!

— Бычкову трэба было, — падказаў хтось.

— Правільна! Трэба было Бычкову — я ягоныя вершы яшчэ ў чацвёртым класе вучыў. Да не падсказалі. Зеўрук гэны дэзінфармаваў, — са скрухай мовіў Камандуючы. — Сказаў, будта Бычкоў — вораг Беларусі і Расіі. А саўмесна — Літвы, Латвіі, Эстоніі, Украіны і Польшчы. Я і паверыў. Падумаў, што Зеўрук ведае — у ЦК ды ў різлічных выведках працаваў. Напрасна, знаеце, даверыўся. Следавала давяраць, но правяраць. Паглядзіце там, ці Спазьняк ужэ не дыхае? Апруцянеў? А то, можа, халастым стрэльнуў?

Нехта ад купкі ля «Гранду-Чырокі» пабег зірнуць на труп Спазьняка, і хутка адтуль пачулася:

— Спазьняк ляжыць. А Залябедзькі няма.

— Як няма? Ён жа застрэліўся.

— Мабыць, сапраўды халастым. Імітацыя, — змрочна мовіў Мэйман.

Гэта прадацельства! Он меня абхітрыў. Хацеў тады разам з Ганчаром, ды… Пажалеў. Вот і расплата за мяккасць душы. Дзейсцьвіцельна, очань мы рахманыя, беларусы. Не тое, што ты, Мэйман.

— Тое, што і ты! — з тайным папрокам надзьмуў вусы генерал-пракурор.

Камандуючы дастаў насоўку і старанна выцер змакрэлыя вочы. Падобна, ён гатовы быў заплакаць, хіба ў ягоным позірку раз-пораз бліскала непрыхаваная хцівасць.

— Я ж цібе прыказаў устраніць Гураўкіна. А он, аказваецца, у ААН зноў ваду муціць проці суверэннай дзяржавы… Паэт гэны.

— Праізашла памылка. Устранілі Гуралкіна. Супадзенне фаміліяў.

— Як жа вазможна! Нада ж ведаць нацыянальныя кадры, атлічаць паэта ад мастака. Не страляць абы-каво…

— Я счытал, у Беларусі адзін мастак — паважаны акадэмік Цавіцкі…

— Правільна! Очань мной паважаны. Как і явоны сын — маладой, но перспекціўны, — русскій, то есць беларускій па духу…

Строй тым часам зусім разбурыўся, стрэлы бахалі ўсё часьцей. Страляліся ад любові да Беларус, ад нянавісці да маскалёў, ад бязмежнае адданасці любаму Камандуючаму. Проста таму, што ўсё надакучыла, у тым ліку і д'ябальскае, крывавае жыццё ў краіне з бясконцай барацьбой і заблытанымі ідэямі. Дзе-нідзе чуліся воклічы «Жыве Беларусь!», часам праклёны ці проста злая мужчынская лаянка. У доле на ўзлеску ўсё большала нерухомых целаў, скрозь на траве валялася зброя, нікому ўжо непатрэбны рыштунак. Найболей таго ляжала каля «Джыпу-Чырокі», дзе ўсё яшчэ тоўкся Камандуючы. Купка чыноў ля яго, аднак, усё менела. Нарэшце застаўся апошні — генерал-пракурор Мэйман.

— Мэйман, ты ўсе мае сакрэты знаеш, да?

— Знаю, да.

— І ты іх сахраніш. Назаўжды!

Генерал-пракурор не паспеў адказаць, як Камандуючы махнуў рукой — і ў яго, бы з рукава, грымнуў нечаканы стрэл. Як Мэйман упаў, Камандуючы яшчэ два разы стрэліў яму ў галаву і крута адвярнуўся.

Пасьля ён уключыў радыётэлефон і мовіў нейкую фразу — пароль ці што: 5485211A2. Сунуўшы ў кішэню HENDI, дастаў з багажніка сцяг — шырокую чырвоную палатніну з сярпом і молатам ля тэлескапічнага дрэўка — і ўскочыў у машыну.

— Газуй, Садам!

Звыкла абыякавы да ўсяго, што адбывалася навокал, чарнавусы кіроўца рыўком зрушыў машыну, якая палявой дарожкай нязграбна папаўзла па выбоінах убок рачулкі. Адной рукой Камандуючы трымаўся за кароткі дзяржак перад сабой, а другой праз вакно высока ўзнімаў сцяг, пад якім нарэшце мелася здзейсніцца вялікая мэта ягонага жыцця — інтэграцыя.

Што рабіць, калі кожная вялікая мэта патрабуе вялікіх намаганняў і няменшых ахвяраў…

«БУКЕТ РУЖАЎ»

І гэтая краіна была бедная (шмат тады было бедных краінаў), з адсталай эканомікай і малакультурным насельніцтвам. Вугалю, нафты або алмазаў у яе не было зусім. Мала таксама было навукоўцаў, пісьменнікаў — хіба што эстрадных спевакоў хапала. Спорт таксама быў слаба развіты, людзі ўмелі гуляць у нарты ды ў класічную гульню — дурня. Краіна была няразвітая, затое мела гучны і модны тытул, звалася Арлінай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікай. Кіраваў ёю, канешне ж, самы мудры арол, ласкава званы ў народзе Грымучы Змей.

І ўсё ж народ меў адну адметную вартасць, якую можна паэтычна назваць — сакалінае вока. Ужо змалку арляняты ўмелі трапна страляць. Адзін вясковы арлёнак у часе вайсковае службы ні разу не спудлаваў у страляніне і стаў чэмпіёнам па стральбе ўсіх відаў. Клікалі яго Сокал. Той яго талент адразу трапіў пад увагу дыктатара Грымучага Змея.

Рэч у тым, што на той час дзе-нідзе ўсвеце загаварылі пра

кілераў. Мабыць, жыццё выявіла пэўную патрэбу ў той прафесіі. Калі дзе трэба было прыбраць празмерна шанцоўнага банкіра або папулярнага палітыка, дык найперш шукалі адмысловага кілера. Адмысловая аперацыя адмысловага спецыяліста патрабавала адмысловага кошту. У Арлінай рэспубліцы таксама ўзнікла пэўная праблема. Грымучы Змей надумаў знішчыць аднаго маладога палітыка, які мог некалі прэтэндаваць на ягонае месца. Зрабіць іначай дыктатар не меў магчымасці, бо на тое месца ўжо быў прызначаны яго родны сын Шыпучы Змяёнак, які пакуль што студыяваў вайсковую навуку ў заморскім Вест-Пойнце. У выніку складанай арганізатарскай аперацыі, праведзенай IX аддзелам аховы дыктатара, малады палітык быў замоўлены маладому кілеру Сокалу, які яго і прыбраў з першага стрэлу. Паховіны адбыліся за дзяржаўны кошт і дужа ўрачыста. Грымучы Змей прыслаў прыгожы вянок чырвоных ружаў з цёплым спачувальным надпісам на стужцы чорнага дзяржаўнага колеру.



Фота www.rt.com

Кілерскі акт у адпаведнасці з сусветнымі стандартам належала стандартна скончыць: каб не пакідаць слядоў – прыбраць і кілера. Так, прынамсі, раілі кваліфікаваныя дарадцы Грымучага Змея. Але Грымучы Змей быў разумнейшы за ўсіх, разам узятых дарадцаў і ніколі няе слухаў іх. Сам ён паходзіў з сялянскага роду і ведаў, што парсючка сяляне не б'юць дачасна. Б'юць упару, калі той нагадуе сала і болей не мае жадных магчымасцяў. Кілер жа Сокал яшчэ меў магчымасці. Таму замест кулі міласэрнасці дыктатар узнагародзіў яго «Ордэнам высакароднасці» і паслаў на новае заданне. Належала ціха і неўпрыкмет прыбраць двух банкіраў і трох агалцелых апазіцыянераў, што сумняваліся ў правільнасці ўнутранай палітыкі дыктатара. Тых апазіцыянераў спрактыкаваны Сокал лёгка застрэліў, а для банкіраў запатрабаваў болей часу. Банкіры мелі моцную ахову.

Банкірскую аперацыю пакуль што адклалі, пачалі рыхтаваць памочнікаў Сокалу. Памочнікаў кілер нумар адзін рыхтаваў асабіста. На закрытым спартовым стадыёне «Дынама-машына» ўвесь божы дзень грымела страляніна – па нерухомых і рухомых мішэнях, вокнах, паверхах, аўтамабілях. Для гарантыі поспеху даваліся купіць у замежжы добрую зброю, бо, як наракаў Сокал, з бярданкі ўзору 1800/1900 года шмат не настраляеш. На закуп была выдаткаваная ладная сума з дохлага дзяржаўнага бюджэту. Грымучы Змей, вядома, быў незадаволены выдаткамі, але як абодва банкіры апынуліся на гарадскіх могілках, падабрэў і выказаў радаснае спачуванне радні банкіраў і кліентам банку. Кілераў жа ўзнагародзіў яшчэ болей высокімі ардэнамі — «За гонар і сумленне». Кілеры былі задаволеныя. Адно кепска, што тых узнагародаў нельга было насіць на грудзях — узнагароджанне лічылася абсалютна сакрэтным.

У Арлінай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы між тым, як і ўсюды, дзеялі замежныя выведкі. Не зважаючы на надзвычайную сакрэтнасць, тым усё ж шмат што стала вядома з кілерскай справы, якая на той час атрымала кодавы назоў «Букет ружаў». Рэч у тым, што і ў суседніх краінах меліся падобныя праблемы, як з нахабнымі апазіцыянерамі, так і з прагнымі банкірамі. Ды не было кілераў. Адсталыя ў пэўных адносінах грамадствы не мелі разумных дыктатараў, болей налягалі на славутую абарону правоў чалавека і занядбалі трапнай стральбой. Вядома ж, апроч як да благога, такое становішча ні да чаго іншага прывесці не магло. Лідар адной з такіх краінаў у рэшце рэшт змушаны быў звярнуцца да Грымучага Змея з сяброўскай просьбай: пазычыць каманду кілераў для выканання аднаго спецзадання. Плата гарантавалася — вядома ж, у далярах. Грымучы Змей памеркаваў і згадзіўся: даляры яму заўсёды былі патрэбныя. Неўзабаве тры кілеры адправіліся ў далёкія заробкі. Між тым Сокал застаўся дома. Дзеля сакрэтнасці яму змянілі прозвішча, аздобу, засакрэцілі месца жыхарства і далі дзяржаўнае заданне — у сціслыя тэрміны навучыць пяцьдзясят кілераў.

Справа закіпела. Усё рабілася дужа таемна, з адмысловым дыпламатычным ды прапагандовым прыкрыццём. Стадыён, дзе трэніраваліся кілеры, атрымаў назоў «Прафсаюзны комплекс старога і немаўляці», база іхняга адпачынку звалася «Турбаза Арлёнак». У прыгожым і прэстыжным прыгарадзе сталіцы кілерам выдзелілі новыя шыкоўныя кватэры. Каму не хапіла новых, у старых зрабілі модны еўрарамонт — з фінскай сантэхнікай і шведскай сталяркай. Былі тэрмінова закупленыя імпартныя снайперскія стрэльбы з найноўшым аптычным прыцэлам. Экзамены ў кілераў прымаў сам дыктатар Грымучы Змей, поспехі навучэнцаў былі надта ўражлівыя. Толькі дзесяць чалавек атрымалі чацьвёркі, астатнія — адны пяцёркі. Пяцёрачнікаў адразу ж выправілі ў камандзіроўкі — далёкія і блізкія, а чацьвёрачнікаў пакінулі дзеля вырашэння ўнутраных праблемаў. Такія праблемы на той час пільна наспелі, і Грымучы Змей змушаны быў прыняць адэкватныя меры. Некаторыя з урадоўцаў не выказалі захаплення ад праекту «Букет ружаў», даводзілі, быццам ён незаконны, малаэфектыўны, нават стратны. Некаторыя намякалі на ягоную амаральнасць. Неўзабаве ўсім давялося на ўласных Галовах пераканацца ў яго эфектыўнасці. Наконт законнасці быў зроблены запыт у Канстытуцыйны суд, які на наступны ж дзень апублікаваў юрыдычнае абгрунтаванне яго абсалютнай законнасці. На трэці дзень наконт маральнасці адказаў галоўны іерарх — усё адпаведна канону. Болей у Арлінай рэспубліцы ніякіх пярэчанняў не было чуваць.

Тым часам сорак пяцёрачнікаў не вярталіся; выканаўшы заданне ў далёкай краіне, выправіліся ў яшчэ болей далёкую. На замежныя рахункі дыктатара плыла валюта, якою той мог падзяліцца з народам. Увогуле дыктатар быў чалавек не скупы, але вялікі прагматык і ўмеў лічыць лішнюю капейку. На немалую суму ён купіў за мяжой партыю яшчэ болей дасканалае зброі (хуткастрэльныя стрэльбы, кулі з адмысловым сардэчнікам) і разгарнуў сістэмную падрыхтоўку высокакваліфікаваных кілераў. Амбасады і гандлёвыя прадстаўніцтвы ў замежных краінах прымалі замовы на індывідуальныя і групавыя тэракты. Замоваў набіралася шмат, рэпутацыя фірмы была дужа высокай. Ніхто не мог супернічаць з сокаламі Грымучага Змея. І ніколі немагчыма было дазнацца, чыіх рук тое ці іншае забойства. Такі эфект дасягаўся комплексам мераў, якім займаліся не толькі кілеры, але і дыпламаты, палітыкі з палітолагамі, а таксама філосафы з барменамі ды горнічнымі гатэляў, — усе былі ўцягнутыя ў слаўную індустрыю тэрору. Звычайна забойства паходзіла на самагубства ці на трагічны вынік сямейных звадак або ўнутраных кланавых разборак. Адміністрацыя Грымучага Змея ніколі не спазнялася паслаць спачуванне на паховіны. Аднойчы здарыўся трагікамічны выпадак, калі з прычыны чынавенскага недагляду факс спачування быў пасланы да моманту забойства і тым павесяліў жывога нябожчыка ды ягоных сяброў. Але ўжо назаўтра сябры горка плакалі, калі знайшлі калегу з прастрэленай галавой. Грымучы Змей з таго выпадку ледзьве не займеў славу новага Настрадамуса, папулярнасць яго ў свеце значна павялічылася. Чыноўнік жа, вінаваты ў недаглядзе, хутка загінуў ва ўласным ложку, як было афіцыйна аб'яўлена, ад стрэлу палюбоўніцы. І ніхто яго не пашкадаваў, нават уласная жонка.

Кілерскую справу паставілі на дзяржаўны паток.

У Арлінай рэспубліцы рыхтаваліся не толькі ўласныя кілерскія кадры, але і навучаліся людзі з іншых краінаў, пераважна з краінаў трэцяга свету. На вуліцах сталічнага горада, асабліва ў выхадны дзень, можна было спаткаць маладых людзей самага розмага колеру скуры, розных формаў вачэй. Калі ў іх пыталіся цікаўныя, дык на ламанай ангельскай мове тыя тлумачылі, што прыехалі вывучаць медыцыну, механіку, будаўніцтва. І то была праўда. Але галоўная праўда палягала ў тым, што толькі трудная навука трапнай стральбы займала іхнюю ўвагу. Іхнія ўрады добра плацілі Грымучаму Змею, які на тыя сродкі збудаваў сабе новы палац, абсталяваў падземны і нават падводны ціры. Гадоў праз дзесяць сучасную кілерскую зброю ўжо не куплялі ў замежжы — наладзілі ўласную вытворчасць. Дзеля таго падрыхтавалі за мяжой неблагія кадры збройнікаў, развілі збройную навуку. Толькі за апошні год у мясцовым тэхналагічным універсітэце на кафедрах ку́лі, затвора і парахавых газаў было абаронена каля сотні доктарскіх дысертацый, столькі ж прысвоена прафесарскіх званняў. Уся краіна жыла надзвычай папулярнымі праблемамі зброі і страляніны. Кілераў шырока выкарыстоўвалі таксама і ў пабытовым жыцці: пакрыўджаныя жонкі за невялікую плату наймалі кілераў для крыўдзіцеля-мужа; тыя ў сваю чаргу тэлефанавалі ў кілерскую кантору, каб замовіць здрадніцу-жонку. Пра кілераў ды іхнія подзвігі штодня пісалі газеты, спявалі эстрадныя гурты. Кожны тамтэйшы падлетак марыў, падросшы, стаць кілерам і з'ехаць у якую-небудзь з заходніх краінаў. Кілеры завіхаліся ўвесь час і ўсюды стралялі. Вясной — лібералаў, улетку — дэмакратаў, пад восень пачалі адстрэл вахабітаў.

Трываючы нечуваны бум, збройная індустрыя краіны прагнула новых інвестыцыяў. Тых немалых сродкаў, што кілеры зараблялі за мяжой, надта не хапала. Мудры Грымучы Змей звярнуўся ў міжнародныя інстанцыі па дапамогу. Канешне, не дзеля вытворчасці зброі, а з прычыны недароду, які быццам бы напаткаў краіну. Дыпламаты за мяжой давялі, што, калі такая дапамога не будзе аказаная, дык народ вымра, і тое ляжа на далікатнае сумленне сусветнай супольнасці. Дапамога была аказаная. Першы і самы буйны транш у валюце дыктатар, не марудзячы, пусціў на вытворчасць навейшае (лазернай) зброі. Гэта была цуд-зброя. Кожны кілер мог весці хуткастрэльны агонь нават у натоўп на плошчы або на вуліцы. Мушка ў каляровым прыцэле з начным бачаннем, пэўным чыпам запраграмаваная, аўтаматычна выбірала цэль з улікам ідэйнасці і палітычнай заангажаванасці ахвяры. Лабараторыю, якая вынайшла той цуд, дыктатар узнагародзіў у поўным складзе. Усе — ад дырэктара да апошняй прыбіральшчыцы і шафёра сталі «Героямі нацыі», або «змеевікамі», як іх клікалі па-навуковаму.

У той жа прыкладна час была вынайдзеная і яшчэ болей дзівосная зброя — віртуальная куля. Варта было ёй у каго-небудзь трапіць, як ахвяра знікала, бы растваралася ў паветры, не накідаючы ні следу, ні дыму. Менавіта з тае пары ў свеце начаді знікаць людзі, без знаку і следу. І ніводны пракурор, ніводны следчы не маглі здабыць жадных улікаў. Сведак не было таксама. Ніхто нічога не чуў, нічога не бачыў. Гэта была вяршыня тэрарыстычнае мары. Багатыя краіны Захаду і Усходу пачалі паляваць на мудрых вынаходцаў краіны Арлоў. Найлепшы сродак у такіх выпадках — класічны: калі нельга знішчыць, дык льга перакупіць. Як ні ўзнагароджваў Грымучы Змей сваіх збройнікаў, тыя неўзабаве сцямілі, што не аднымі ўзнагародамі жыве чалавек. На Захадзе жылі і яшчэ шмат чым, мелі куды болей і лепшага. Спярша застаўся ў камандзіроўцы на Захадзе, куды паехаў, адзін з лепшых кілераў. Пасля на Усход збег вучоны, ён жа вядомы акадэмік і сакрэтны выведнік. Гэты, апроч уласных мазгоў, прыхапіў з сабой надзвычай важныя звесткі. І паводле адной з іх, для таго, каб забіць чалавека, не трэба ў яго нават цэліць. Даволі за сотню міль ад яго набраць на кампутары пэўны код, і чалавек умомант знікаў, раствараўся ў віртуальнай прасторы. Гэтак аднойчы на пачатку вясны знік і дыктатар, мудры і вялікі Грымучы Змей. Быў, сядзеў за сталом, падпісваў чарговы пук высокіх указаў і — знік. На стале засталася адно залатая асадка. Затым загадкава знік і ягоны наступнік — малады Шыпучы Змяёнак. Можа, таксама стаўся ахвярай, а можа, ірвануў кіпці ў Бермудскую афшорную зону — бліжэй да сваіх банкаўскіх рахункаў. Слаўны праект «Букет ружаў» з таго часу непапраўна завяў.

Арліная Народна-Дэмакратычная Рэспубліка зазнала нечуваны заняпад. Пачаўся голад, міжнацыянальныя ды міжканфесійныя разборкі. Родзічы шматлікіх кілерскіх ахвяраў запатрабавалі суду над выканаўцамі даўніх і свежых тэрактаў. Пранырлівыя журналісты ды папарацы раскапалі сакрэтныя архівы, дзе знайшлі нямала імёнаў славутых у краіне людзей з іх вельмі непрывабнымі справамі. Грамадскасць запатрабавала суду і пакарання. Тады ж выявілася і пэўная несправядлівасць лёсу гэтых людзей. Калі імі ганарылася нацыя, тады яны змушаныя былі заставацца інкогніта, а як справа дайшла да адказнасці, дык іхнія імёны выдрукавалі ўсе газеты. Без карысці засталіся і шматлікія высокія ўзнагароды. Тое было крыўдна і несправядліва, людзі абураліся. Але што ў свеце ёсць справядлівае?

Слуп

Луіс ЛЬЯК

Дзед мне казаў на парозе,
покуль чакалі святла,
а ля слупа пры дарозе
сумна жывёла раўла:
«Слуп, як нашая доля,
так прывязаны і мы».
Звалім яго, каб ніколі
болей не ведаць турмы!

Давай наляжам дружна ўсе!
Ён не ўстаіць, яго трасе.
Ён хутка рухне, рухне, рухне,
бо струхлеў, прагніў, прасеў.
Хістай мацней ганебны слуп!
Ён вораг волі і святлу.
Ён хутка рухне, рухне, рухне,
і дабро дасць рады злу!

Вёсны мінаюць і зімы,
рукі падзерліся ў кроў,
а слуп у сэрцы радзімы
магутнейшы ад муроў.
Я ведаю, ён прагнілы,
ды ўбіты глыбока ў душу,
і я, губляючы сілы,
у песні падмогі прашу.

Давай наляжам дружна ўсе!
Ён не ўстаіць, яго трасе.
Ён хутка рухне, рухне, рухне,
бо струхлеў, прагніў, прасеў.
Хістай мацней ганебны слуп!
Ён вораг волі і святлу.
Ён хутка рухне, рухне, рухне,
і дабро дасць рады злу!

Дзед не спяе ужо нічога,
знеслі злыя вятры
ў вырай майго старога,
і я ўсё болей стары.
Ды каб маладыя пачулі,
стаю на парозе й пяю
апошнюю песню дзядулі,
як першую песню сваю.

Давай наляжам дружна ўсе!
Ён не ўстаіць, яго трасе.
Ён хутка рухне, рухне, рухне,
бо струхлеў, прагніў, прасеў.
Хістай мацней ганебны слуп!
Ён вораг волі і святлу.
Ён хутка рухне, рухне, рухне,
і дабро дасць рады злу!

Пераклаў з каталанскай Андрэй Хадановіч

Перамен

Віктар ЦОЙ

Прывід цяпла ў зелені шкла,
прывід агню — дым.
З кратаў гадоў каляндар выхапіў дзень.
Вогнішча сонца згарае датла,
дзень дагарае з ім,
на распалены горад падае цень.
«Перамен!» — прагнуць мільёны вачэй.
«Перамен!» — грукаюць сэрцы хутчэй.
У нашым смеху і ў нашых слязах, і ў пульсацыі вен
«Перамен! Хутчэй перамен!».

Электрычны прамень нам працягвае дзень,
не шукайма запалак — дарма,
ды на кухні, як сіні квет, гарыць газ.
Цыгарэты ў руках, чай на стале, схема працуе сама,
і больш нічога няма — усё астатняе ў нас!
«Перамен!» — прагнуць мільёны вачэй.
«Перамен!» — грукаюць сэрцы хутчэй.
У нашым смеху і ў нашых слязах,
і ў пульсацыі вен
«Перамен! Хутчэй перамен!»

Мы не будзем фарсіць красамоўствам вачэй,
ані зграбнымі рухамі рук,
нам не трэба таго, каб адно аднаму не змяніць.
Цыгарэты ў руках, чай на стале, так замыкаецца круг,
і раптам нам робіцца страшна нешта змяніць.
«Перамен!» — прагнуць мільёны вачэй.
«Перамен!» — грукаюць сэрцы хутчэй.
У нашым смеху і ў нашых слязах, і ў пульсацыі вен
«Перамен! Хутчэй перамен!».

Пераклаў з рускай Андрэй Хадановіч


Фота www.humanities.by

Малітва

Генадзь БУРАЎКІН

Мы здалёку ўбачылі свабоду
І яшчэ не вырваліся з пут…
Божа,
не дабаў майму народу
пошасці,
няпраўды
і пакут.

У чужым нялюдскім землятрусе
хіба ў нечым мелі мы віну?..
Божа,
адвядзі ад Беларусі
здраду,
вераломства
і вайну.

Смутнаю парою нелюдзімай,
калі ўсё вакол ідзе на злом,
Божа,
захіні маю Радзіму
мудрасцю,
спакоем,
і цяплом.

***

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

Народу можа засціць зрок
без дай прычыны.
Ды бачыць Госпад кожны крок
на звод Айчыны.

У вочы вам адплаты час
зірне сурова.
Каб дзеці апраўдалі вас —
вярніце Мову!

Няма пачаткаў і канцоў,
усё — працяг.
Каб не ўскіпела ў жылах кроў —
вярніце Сцяг!

Улады сверб, што вас скубе,
і славы сверб —
пакіньце ўсё сваё сабе,
вярніце Герб!

Дальбог, пра гэта не са зла
малюся ў скрусе,
а каб зямля вас прыняла
на Беларусі.

Напярэдадні рэферэндуму

Алесь КАСКО

Вось — галоўны гісторыі ход:
пагарджаны вякамі народ,
што душою аглух і аслеп,
плюе ў мову, і ў сцяг свой, і ў герб.

І тады, як адвернецца свет,
не апомніцеся, прэзідэнт?
— Нет.

Набрыняе крывёй каляндар,
кіне Бога сумленны святар.
Роспач вусны прароку замкне,
вучні ўтопяць жалобу ў віне.

І тады, як смерць прыме паэт,
не пакаецеся, прэзідэнт?
— Нет.

Шчэ ёсць вера ў інакшы зыход:
да глумлення не дойдзе народ
са святыняў сваіх, напаказ…

І тады, калі грымне адказ,
што не гнюс ён і не самаед, —
не застрэліцеся, прэзідэнт?
— Нет.

Лебяда

Алесь ПАШКЕВІЧ

Адцвілі васількі на пожні,
лебяда ля хат, —
у краіне, дзе кожны
ці вораг, ці кат.

І ні радасці, і ні хлеба,
ні вады жывой.
Паміраем пад сонным небам
на зямлі з лебядой,

дзе і пан, і прарок найпершы —
зброды зяць,
загадаць можа й вершы
не пісаць…

А яны ў нас і так без рыфмаў,
нібы сэрцы без пульсу-біцця,
нібы сцежкі марскія без рыфаў,
быццам смерць — без жыцця.

Пераможам

Анатоль ІВАШЧАНКА

Ад таго, што наўкола,
няпроста не страціць розум.
Словы рэжуць горла,
па сэрцы ідуць барозны.
Пацукоў ванітуе,
іх човен трасе.
Але здрыснулі з борта
далёка яшчэ не ўсе.
Можа, моцныя ды смелыя
ўсе
закапаны ў полі?
Бел-чырвона-белыя
душы
равуць ад болю.
Выбух. Святло.
Ціша.
І…
новы гук.
Гэта недакладна, але
нараджаецца пацук.
Жывіцца праклёнамі лжывы псіхапат.
Ў белых паліто нах стратэгі.
Шах і мат.
Ружы нашыя
ператворацца
ў ружжы раптам.
Нават херувімы цяпер
размаўляюць матам.
Гэтыя радкі, імаверна,
начынены тратылам.
Ключык залаты
Тартыла
зжэрла ды забыла.
Гэтыя радкі, верагодна,
прапітаны напалмам.
Моцныя ды смелыя,
мы
пераможам малпаў…

***

Усевалад СЦЕБУРАКА

Я не мару — не той узрост,
не баюся — не тая цэмра.
Падымаюся ў поўны рост —
не пабачыць пакоры хеўра.

Хай паўсюль цікуюць вiжы:
не маўчу і трымаю слова,
бо за мною — мае крыжы
і мая ўкрыжаваная мова.

Не за славай стаю ў чарзе,
не прыспешваю рух падзеяў,
толькі праўда й тады жыве,
калі даўна няма надзеяў.

Толькі б тут на зямлі датрываць,
а пасля адпрашуся і ў Бога —
буду й мёртвы ў шыхце стаяць
не слабей за сябе жывога.

***

Аксана СПРЫНЧАН

лепей не азірацца
бо за спінай тваёю
заўжды аўтазак
нават калі яго яшчэ не відаць
ён ёсць за хмызамі
дамамі
за крывёю яго не відаць
за крыкамі і стогнамі
не чуваць
лепей ісці насустрач Волі
нават калі вертазакі ў небе
нават калі пад зямлёй метразакі
ісці пад вятрамі
залевамі
градам
каб не пакінуць
Беларусь
гадам

Незалежнасць — гэта…



Уладзімір АРЛОЎ

Незалежнасць — гэта калі ты з'явішся на свет у радзільні, дзе няма самых стэрыльных на зямлі савецкіх прусакоў, затое ёсць аднаразовыя шпрыцы і пялюшкі.

Незалежнасць — гэта калі твой бацька пойдзе ў ЗАГС, каб атрымаць дакумент, што ты сапраўды нарадзіўся і што цябе назвалі ў гонар дзеда Рыгорам, і кабета, якая сядзіць там, спакойна выпіша яму гэты дакумент, а не выцягне са стала «Справочник личных имён народов СССР» і не будзе, размахваючы ім, гістэрычна тлумачыць твайму бацьку, што ён можа без праблем назваць сына Файзулой ці нават Мамаем, а вось Рыгорам — не можа, бо такога імя проста не існуе ў прыродзе (а существует нормальное человеческое имя Григорий).

Незалежнасць — гэта калі ты пойдзеш у школу і цябе будуць вучыць на тваёй мове (а дзяўчынку Гражынку, якая падабалася табе ў дзіцячым садзе, — на яе мове, а твайго суседа хлопчыка Мішу, тату якога завуць Ісакам, — на ягонай, а другога твайго суседа хлопчыка Алёшу, бацькі якога прыехалі сюды, бо ў іхнім горадзе на Волзе, каб купіць малому малака, трэба займаць чаргу а пятай гадзіне раніцы, — на ягонай). Цябе будуць вучыць на тваёй мове, і дзеля гэтага тваім тату й маме не трэба будзе ўсё лета збіраць па кватэрах заявы бацькоў, якія не тое каб не хацелі вучыць сваіх дзетак так, як твае тата й мама, а проста ніколі пра гэта не думалі, бо выраслі пры інтэрнацыяналізме. І гэтыя заявы не трэба будзе губляць тры разы дырэктару й два — сакратарцы, і ў першы вераснёвы дзень ты не пачуеш на ўрачыстай лінейцы, што «год от года хорошеет материально-техническая база нашей школы», а прыйшоўшы ў свой клас не даведаешся, што дзякуючы няўхільнаму клопату партыі й ураду, у вас на ўвесь клас толькі адзін лемантар і дзве «матэматыкі» на роднай мове.

Незалежнасць — гэта калі твая дружына не будзе змагацца за права насіць імя Паўліка Марозава ці Аляксандра Мяснікова, бо ўсе вы цудоўна ведаеце, як любіў свайго татку Паўлік і як любіў беларусаў Мяснікоў.

Незалежнасць — гэта калі ты будзеш студэнтам і на лекцыі па вышэйшай матэматыцы твой раўналетак з Мадагаскару, які вучыцца за грошы сваёй, а не тваёй краіны, нахінецца да цябе і запытае, што значыць слова «імавернасць», і ты па-французску растлумачыш яму.

Незалежнасць — гэта калі ты будзеш служыць у войску не далей за памежны горад ці вёску тваёй зямлі, затое табе ніколі не загадаюць фарбаваць траву і прыбіраць тэрыторыю «вот от сюда и до обеда». У нядзелю ты зможаш прыехаць да бацькоў ці да сваёй дзяўчыны, затое ніхто не назаве цябе «бульбашом», а твайго сябра — «черножопым» за тое, што вы думаеце й гаворыце ў сне па-свойму, і выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі не будуць у працэсе гэтай падрыхтоўкі рабіць табе «велосипед», і табе ніколі не загадаюць гастрыць сапёрную рыдлёўку, каб акапацца ў Баку ці ў Тбілісі.

Незалежнасць — гэта калі твая дзяўчына кажа, што хоча на выходныя ў Вену, і ты з чыстым сумленнем абяцаеш ёй, што ў суботу вы вып'яце кавы насупраць палацу Шонбрун, і ведаеш, што перад вашай вандроўкаю ніхто не будзе высвятляць у цябе, ці быў ты ў дзяцінстве габрэем, а таксама, ці быў ты раней за мяжою і калі вярнуўся адтуль, дык з якой мэтаю.

Незалежнасць — гэта калі на Дзяды, у Дзень памяці продкаў, ты ідзеш на могілкі й ведаеш, што паставіш там свечку й пакладзеш кветкі, а не станеш удзельнікам выпрабавання балончыкаў з нервова-паралітычным газам ці новае мадэлі гумовага дручка.

Незалежнасць — гэта калі твой сын прынёс са школы пяцёрку па гісторыі і ты хваліш яго за гэтую пяцёрку, бо ведаеш, што ён атрымаў яе не па тым прадмеце, дзе вучаць пра Лядовае пабоішча і перамогу калектывізацыі, а па тым, дзе вучаць пра Грунвальдскую бітву, якая ўратавала твой народ ад смерці, і кажуць праўду пра тую ўладу, што растраляла твойго дзеда й задушыла голадам тваю бабулю.

Незалежнасць — гэта калі да цябе завітае спявак з Нью-Ёрку, і ты вып'еш з ім добрую чарку вішнёўкі, і пасля ветлівыя дзядзькі ў цывільным не запрапануюць табе падрабязна напісаць, дзе й што вы пілі й каго пры гэтым лаялі.

Незалежнасць — гэта калі ты пазбаўлены магчымасці пачуць, як твой прэзідэнт вучыць з экрана суайчыннікаў: «Хто как хаціт, той так і гаварыт», бо твой прэзідэнт — чалавек пісьменны і хоць адну мову ўсё ж ведае.

Незалежнасць — гэта калі з тэлеперадач і газет раптам знікаюць лісты нястомна-таямнічых ветэранаў і вусцішныя паведамленні пра нацыяналістаў і экстрэмістаў з народных франтоў, якія нават уначы не спяць, а распальваюць паміж табой, Алёшам і Мішам, тату якога звалі Ісакам, а таксама Гражынаю, якая даўно ўжо твая жонка, міжнацыянальную варожасць, каб учыніць сярод вас крывавую разню й пусціць пад адхон цягнік перабудовы.

Незалежнасць — гэта калі ніхто не страшыць цябе, што твой народ не зможа выжыць без вялікага старэйшага брата, бо не мае сваіх баксітаў ці алмазаў, і ты разумееш, што зусім дарэмна шкадаваў гарапашных галандцаў ці бельгійцаў, якія не маюць ні баксітаў, ні алмазаў, ні нават старэйшага брата.

Незалежнасць — гэта калі велізарныя фуры з надпісам «Центровывоз» (ці бачыў ты хоць раз такія фуры з надпісам «Центроввоз»?) падрулююць не да чужых, а да нашых крамаў.

Незалежнасць — гэта калі раптам высветліцца, што разумныя людзі ёсць і ў нас, і калі — крый Божа! — выбухне завод ці прычыніцца якое іншае ліха, не трэба будзе чакаць, пакуль прыедзе камісія з маскоўскіх разумнікаў.

Незалежнасць — гэта калі на Божай пасцелі ведаеш, што пасля таго, як ты памяняеш гэты свет на лепшы, на месцы царквы ці касцёла, дзе цябе хрысцілі і дзе ты вянчаўся, не выкапаюць сажалку з брудным лебедзем і не пабудуюць басейн імя XXVIII з'езда КПСС, а могілкі, дзе будуць спачываць твае косці, не знясуць і не ператвораць у закіданы пустымі пляшкамі парк культуры й адпачынку імя таварыша Гарбачова або імя таварыша Лігачова.

Незалежнасць — гэта...

Незалежнасць — гэта калі ад нараджэння да скону пачуваешся сваім чалавекам на сваёй зямлі.

Я веру, што калі-небудзь так будзе.

Бо іначай проста не варта жыць.

1990 год

Лапаціна



Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

Прыпавесць

“Литвинку божи?!.
Тю, литвинку ти ж чортів!”
“Ага, хай і чортів,
аби не твой!”
З украінскага фальклору

Сонца над Ярылавай гарой узыходзіла вясёлае — зусім не па настроі Ціта. Але што зробіш з сонцам? З Ярылам? Тут з самім сабой не зробіш нічога, а не тое што з богам...

Апошнімі гадамі Ярыла не ўзлюбіў за нешта Нальшу. Вось і ў гэтым годзе яшчэ напачатку лета спаліў збажыну. Чаму ён бяду наслаў, на каго, на што зазлаваў? — пра тое нават вайдэлот Тур і вярхоўны вяшчун Крыва—Крывэйта, які прыехаў у Крэва, каб прынесці ахвяры Ярылу, не дазналіся. Увесь чэрвень стаяла гэткая спёка, што, здавалася, плавіліся камяні, і сям'ю Ціта, да якой хутка павінен быў дадацца яшчэ адзін рот, зімой чакаў голад. Дый не толькі сям'і Ціта, а ўсяму Крэву, усёй Нальшы, на зямлі якой і без сонечных пажараў было ледзьве пракарміцца, выпадала гэтым годам галадаваць.

— Давайце мне лапаціну, — сказаў Ціт сынам, як толькі паснедалі. І паклаў каля пустой місы, выцершы хлебам, лыжку. — Мілава хутка народзіць, до мне ўжо...

Сыны ягоныя, старэйшы Віт, сярэдні Дан, муж Мілавы, ад якой не сёння-заўтра павінен быў з'явіцца ў Ціта ўнук, і малодшы Юр даелі сваё, таксама выцерлі хлебам і паклалі на стол лыжкі.

— Сёння?.. Ці заўтра? — спытаў Віт па праву старэйшага. І калі бацька, прамаўчаўшы на першае пытанне, на другое кіўнуў, Віт падняўся з-за стала. — Заўтра дык заўтра.

За ім падняліся Дан з Юрам. Гаварыць болей не было пра што. Воля бацькі — гэта воля бацькі. Як сказаў, гэтак мусіць быць.

З сівой даўніны вёўся ў Нальшанскай зямлі звычай: калі гаспадар, састарэўшы, знемагаў, не мог ні пасеяць, ні пажаць, ні змалаціць, а толькі з'есці, ён ці перасяляўся з чырвонага, гаспадарскага кута ў запечка, ці, каб не быць у сям'і нахлебнікам, прасіў даць яму лапаціну.

Большасць выбірала запечка. А лапаціну выбіраў той, хто не хацеў дажываць жыццё з мышамі.

Звычай патрабаваў, каб лапаціна была альбо з гумна, дзе ёй збожжа на таку веялі, альбо з хаты, дзе на ёй цеста ў печ ставілі. Каб мела дачыненне да хлеба — і было зразумела: усё. Сыта ці не, але наеўся. З'еў чалавек сваё.

Пад захад сонца ён падымаўся з лапацінай на Ярылаву гару, дзевяць разоў абыходзіў вяршыню, укленчваў на капішчы, маліўся Ярылу, а ў хвіліну, калі сонца хавалася за небасхіл, нахіляўся ўслед за ім, кладучы галаву на ахвярны камень. Лапаціну, якую прынёс ён на плячах, браў ягоны наймалодшы сын і біў па патыліцы. Звычай патрабаваў, каб абавязкова наймалодшы — гэтак замыкаўся чарговы круг жыцця. З апошнімі сонечнымі іскрамі цвіркала, пырскала кроў, і жыццё заходзіла, закочвалася за мяжу зямлі і неба разам з сонцам...

Ціт не мог выбраць запечка.

— Што гэта з бацькам? — спытаў Дан братоў, збіраючыся ў сваю буду ў Багушоўскім лесе, дзе ён драў бяросту, нарыхтоўваў смалу, дзёгаць, вугаль. — Яму ж не час, здаровы яшчэ.

— Сын твой здаравейшы будзе, — кіўнуў Віт на Мілаву, якая грэла на сонцы пад сцяной пуні свой вялізны жывот. — Не сёння-заўтра адным ротам стане болей. Значыць, адным ротам мусіць меней стаць.

«Хто ж ведаў, што голад...» — хацеў сказаць Дан, але Юр раней сказаў: «Ты чаго яго вінаваціш? Ён жа не ведаў, што голад. А калі б і ведаў, дык што?..».

На тым размова між братамі скончылася. Юр пайшоў на свой пчальнік, а Віт, глянуўшы на круглыя грудзі над круглым жыватом Мілавы, сказаў, аблізаўшыся:

— А тое. Не трэба было гэтую смалянку да нас цягнуць. Праз яе ўсе беды. І вось пабачыш, Дан: яны яшчэ не скончыліся. Калі не так, няхай мне ні рыбы ў рацэ, ні звера ў лесе.

Юр у іх сям'і пчаляры, бортнічаў, бо чым яшчэ, як не пчоламі, аднарукаму займацца, а Віт паляваў ды рыбачыў. Ён склаў высушаныя сеці, каб паставіць іх у Крэўлянцы на стронгу, зірнуў яшчэ раз на Мілаву і пайшоў да ракі.

Пра тое, што было, Віт праўду сказаў. Але пра тое, што будзе, багам ведаць, а не Віту.

Беды пачаліся пасля наезда на Смаленскае княства, адкуль вярнуліся нальшанцы з багатымі абозамі, лупамі, а Дан яшчэ й з паланянкай. Ён не ведаў, як насамрэч яе зваць, а яна не казала, дык Дан сам назваў паланянку Мілавай. Вядома, сапраўднае імя яе было іншае, хрысціянскае, смаляне не трымаліся гэтак за паганскую веру і звычаі продкаў, як нальшанцы, але якая розніца, як называецца гэткае дзіва...

Мілава была прыгожая, як Ляля. Багіня прыгажосці. Высокая, гнуткая, з васільковымі вачыма, белая-белая з чорнымі, як смоль, валасамі. Дан казаў, што знайшоў яе ў палацы князя, але што яна там рабіла, кім была, ад Мілавы было не дазнацца.

Смалянаў падчас апошняга наезда Нальшы ўжо абклала данінай Арда, так што выходзіла, нібы нальшанцы ўзялі ў Смаленску не сваё, ардынскае. Таму меней чым праз год паскакала на Нальшу шалёнае войска хана Бурундая разам з дружынай валынскага князя Васількі Рамановіча. Нальшанскі князь Даўмонт кінуўся па дапамогу ў Навагардак да сваяка, вялікага князя літоўскага Міндава, але сваяк не дапамог. Было ў яго іншае на мэце: далучыць да Навагрудка, да Літвы нальшанскую зямлю, аслабленую набегам Бурундая. А ў Крэва разам з князем Васількам прыскакаў смаленскі князь Глеб, і разам яны Крэва нішчылі, палілі, шукаючы паланянку, пра якую казалі, што яна была нявесткай смаленскага князя, але не знайшлі яе, схаваную Данам у будзе ў Багушоўскім лесе.

Калі Васілька з Глебам пакінулі абрабаванае Крэва, калі Дан прывёў Мілаву, і калі ўсе, хто застаўся жывы, запатрабавалі прынесці яе ў ахвяру Ярылу, каб ён злітаваўся над Нальшай, вайдэлот Тур сказаў: «Не. Ярыла даў мне знак, што яму патрэбная іншая ахвяра. Большая, чым паланянка. А якая — пакуль знаку не было». І ўсе, паглядзеўшы адзін на аднаго, прамаўчалі, не ведаючы, што гэта Ціт шапнуў вайдэлоту Туру: «Калі першай ахвярай стане смалянка, другой станеш ты». А вайдэлот Тур ведаў, як і ўсе ведалі, што Ціт, які колькі жыў на зямлі, столькі ваяваў, назабіваўшы людзей больш, чым іх засталося ў Крэве, слоў на вецер не кідае.

Быў той знак ці не было таго знаку, але паланянку Мілаву не ахвяравалі Ярылу, а ў Навагрудку нечакана памерла вялікая княгіня Марта. Жонка вялікага князя Міндава. Сястра княгіні Агны, жонкі князя Даўмонта. Здаровая, трыццацігадовая — і раптам.

Дзіўная смерць. «Вялікая княгіня — вялікая ахвяра, якой хацеў Ярыла!» — абвясціў вайдэлот Тур, і ўсе на нейкі час супакоіліся, апроч самога Ярылы і вялікага князя Міндава.

Некалі Марта звалася Ведай і была жонкай князя Вішымунта, якога разам з братамі ягонымі Ердзівілам і Спрудзейкам забіў Міндаў, каб узяць Веду — гэтак яна яму глянулася. І ўзяў ён паганку Веду, якую ахрысціў у Марту, і яна нарадзіла яму двух сыноў, Рэпіка і Руклю. Гуляючы з імі перад сном, Марта й памерла.

Аповесць пра чалавека,



Сяргей ЕГАРЭЙЧАНКА

Спякотны травеньскі дзень пераваліў за сярэдзіну. Сонца завісла над вершалінамі елак, яго промні хутка сушылі аголеную рыдлёўкамі глебу. Сярод зялёнага дывана маладой травы чорнымі плямамі зеўралі тры глыбокія ямы. Рота байцоў страйбата ўжо некалькі гадзінаў працягвала працу, абсалютна не разумеючы, для чаго яна патрэбна.

Але былі тут і тыя, для каго гэтая справа была не толькі не бессэнсоўнай, але й выключнай. Такіх людзей некалькі: спецыялісты-археолагі Інстытута гісторыі ды мясцовыя партыйныя функцыянеры.

— Вацлаў Міхайлавіч, — з аднаго раскопу пачуўся нізкі голас салдата. — Вам трэба на гэта паглядзець.

— Костка... — прашаптаў навуковец, асцярожна прымаючы знаходку. Нельга было вызначыць, што гэта за костка — рыдлёўка салдата, стомленага працай, проста размалаціла яе на шмат маленькіх фрагментаў, якія не паддаваліся ніякай ідэнтыфікацыі.

— Далей капаць з максімальнай асцярожнасцю!

Да справы падключыліся прафесіяналы-археолагі. Праз дваццаць хвілінаў перад вачыма непрыемна здзіўленых чыноўнікаў з'явілася жахлівае відовішча: добра захаваны чэрап з акуратнай дзірачкай на патыліцы. Верхняй пярэдняй часткі фактычна не існавала — яе праламала куля на выхадзе.

Мы хацелі жыць. Вось усё, чаго мы хацелі. Жыць і працаваць. У нас не было дзяцей — мы былі яшчэ занадта маладымі.

Я спецыяльна кажу «мы». «Мы» — гэта я і мая жонка, разам з якой закончылі настаўніцкія курсы. Нам пашчасціла: размеркавалі з улікам нашага шлюбу.

Мне было дваццаць шэсць. Ёй — дваццаць чатыры. Мяне звалі Савіцкі Максім Леанідавіч. Яе — Савіцкая (Самусевіч) Тацціяна Віктараўна.

Ішла восень тысяча дзевяцьсот трыццаць шостага... <...>

За пяць хвілінаў да пачатку ўрока ў дзверы зайшлі высокі малады чалавек, апрануты ў вайсковае галіфэ, і дзяўчынка.

— Старшы лейтэнант дзяржбяспекі Звягінцаў, — прадставіўся ён. — Да вас учора заходзіў маёр Раманаў...

— Так, так, вітаю, — я падняўся. — А гэта, напэўна, Валя, так?

— Дакладна, — кіўнуў галавой лейтэнант.

— Наколькі разумею, вам трэба атрымаць дакументы?

— Так, вядома. Але гэта зойме няшмат часу.

Я запісаў дадзеныя дачкі маёра ў ведамасць: Раманава Валянціна Віктараўна, 1928 года нараджэння, першы клас скончыла ў Смаленску. Я нічога не наблытаў?

— Не. Усё дакладна.

— Выдатна. У такім выпадку, я больш не буду вас затрымліваць.

— Калі мне зайсці па Валю? — запытаўся лейтэнант.

— Можаце забраць яе а палове на трэцюю.

— Дзякую, — ён казырнуў і хуткім крокам выйшаў з памяшкання...

Вацлаў Міхайлавіч Міраноўскі прыгладзіў адной рукой напаўсівыя валасы. Археолагу ішоў пяцьдзясят шосты год. Менавіта ён і кіраваў тымі раскопкамі, падчас якіх і былі знойдзеныя пахаванні расстраляных. Незвычайныя знаходкі ён дэманстраваў свайму вучню — аспіранту Акадэміі, дваццацітрохгадоваму хлопцу, які стаяў побач з ім і з вялікай цікавасцю разглядаў прадметы, выцягнутыя яго́ным настаўнікам з пластыкавых пакетаў.

— Вось паглядзі сюды. Партсігар алюмініевы, цікавая знаходка. Большасць ахвяраў яўна паходзіла з простых людзей...

— Вацлаў Міхайлавіч, — аспірант адважыўся на пытанне. — А колькі чалавек было ў раскапанай яме?

— Калі падлічыць усе фрагменты костак, атрымліваецца, што не менш сарака пяці.

— А колькі выяўлена магільняў?

— Ах, вось ты да чаго... Мы налічылі дзвесце трынаццаць.

— То бок, калі ўзяць за сярэднюю колькасць сорак пяць, атрымліваецца каля... — аспірант моўчкі шавяліў вуснамі, падлічваючы пра сябе. — ...дзесяці тысячаў чалавек!!!

— Я лічу, што ўсё ж такі менш. Па-першае, гэта даволі вялікая яма. Ну а па-другое... Мы не можам быць упэўненымі, што ва ўсіх ямах ёсць пахаванні. Пэўная частка з іх можа быць пустымі. Але на гэтым палігоне, мяркую, ляжыць не менш за сем-восем тысячаў чалавек.

— Сем тысячаў... А колькі можа быць такіх месцаў?..

— Ніхто не скажа табе цяпер, колькі. Адно магу сказаць — шмат.

На століку ля вакна раптам зайшоўся заліўістым перакатам тэлефон. Вацлаў Міхайлавіч цяжка падняўся з-за стала і падышоў.

— Слухаю.

— Вацлаў Міхайлавіч Міраноўскі?

— Так.

— Вацлаў Міхайлавіч, вам лепей зьгарнуць вашыя даследаванні адносна масавых пахаванняў, якімі вы займаецеся ад мінулага тыдня, і перадаць справу вайсковай пракуратуры.

— З кім я размаўляю? Назавіцеся.

— Вацлаў Міхайлавіч, гэта вельмі настойлівая парада. Даследаванні могуць быць вельмі непажаданымі, а іх вынікі даволі небяспечнымі. Пакуль гэта толькі парада.

— Назавіце сябе!

— Маёр Камітэта дзяржбяспекі Міхалевіч... <...>

Аднекуль з гораду праз нашую вёску пачалі гойсаць вялікія чорныя машыны з крытым кузавам. Пакрысе яны прабілі праз снег і



прамерзлую глебу глыбокія каляіны — аж да самага лесу.

А на пачатку снежня ў лесе пачалося будаўніцтва. Побач з чорнымі крытымі грузавікамі з'явіліся грузавікі з адкрытымі бартамі, на якіх везлі ў лес апрацаваныя дошкі і будаўнічы матэрыял. За два тыдні трохметровы плот абкружыў лес на пяць кіламетраў углыб. На ўездзе ў лес была збітая агромістая брама. Штодзень і штоноч каля яе неслі варту два шарагоўцы НКУС...

Заняткі скончыліся дваццаць хвілінаў таму. Я пакрысе збіраў свае рэчы, перыядычна адказваючы на дзіцячыя словы развітання. Ля задніх сталоў стаялі і аб чымсьці шапталіся Ясік з Валяй. Дзеці пасябравалі, я часта заўважаў, як яны разам сыходзілі са школы, калі па Валю не заходзіў бацька-маёр альбо Звягінцаў.

— А вы чаму не сыходзіце дадому? — ветліва запытаўся я.

Яны асцярожна наблізіліся да мяне.

— Максім Леанідавіч... мы... Мы б хацелі...

— Калі ласка, я вас слухаю. У вас штосьці здарылася?

— Максім Леанідавіч... мы наконт той высокай брамы ў лесе.

— Тааак... — жэстам я загадаў ім сесці за стол перада мной, сам пайшоў і зачыніў дзверы ў класны пакой. — Вы хадзілі да брамы?

— Так, мы хадзілі. Мы... — голас Валі дрыжэў і зрываўся, было добра бачна, што яна вельмі хвалявалася і ледзьве стрымлівалася ад таго, каб не заплакаць.

Размову працягнуў Ясік.

— Максім Леанідавіч, толькі не лайцеся на нас! Мы... нам няма чаго было рабіць, і мае, і Валіны бацькі затрымліваюцца на працы ажно да ночы, вось мы і бадзяемся разам... Прыкладна за кіламетр ад брамы мы знайшлі лаз... Мы пралезлі і выйшлі да вялікай прагаліны. Там было шмат людзей у форме. Яны размаўлялі паміж сабой, палілі цыгарэты. Частка з іх збірала нейкія рэчы. А за імі вялікі бульдозер раўняў чамусьці раскапаную яму — яна была ўжо засыпаная. Але галоўнае не гэта. Галоўнае, што... гэтая яма дыхала! — Валя ледзьве не закрычала, і па яе шчоках нарэшце пацяклі слёзы.

— Цішэй, калі ласка!

— Максім Леанідавіч, яма насамрэч дыхала <...>.

Дзверы былі адчыненыя, калі я вярнуўся дадому. Я не здзівіўся — мы зрэдку зачынялі хату. Але штосьці было не так, як звычайна...

— Таня! Таняяяя!

Ты не адгукнулася.

— Тааааня!

Шкло. Бітае шкло пад нагамі. Абрус, скінуты са стала, перагорнутая шафа з кнігамі.

— Паненку забралі, Максім Леанідавіч, — я раптам пачуў асцярожны голас за спіной.

За дзвярыма стаяла нашая суседка — суханькая бабка, якая заўсёды прыносіла нам яйкі і малако. Яна стаяла, прыціснуўшы тонкія рукі да грудзей, і вачыма, напоўненымі слязмі, глядзела на мяне.

— Хто забраў? Куды?

— Тыя самыя, з Камісарыяту, якія да вас прыходзілі некалькі разоў. Іх было чалавек пяць, і Звя... Звягінцаў...

Я ўжо не слухаў, я бег да ўпраўлення НКУС, якое месцілася праз дзве вуліцы ад нашага дома. Людзі спалохана глядзелі мне ўслед, але мне было не да іх. Хутчэй, хутчэй...

У дзверы я ўламаўся не спыняючыся, наўпрост наляцеўшы на іх локцем. Адшукаў дзяжурнага. Мне падалося, што ён не пазнаў мяне, але праз секунду ўжо расплыўся цынічнай пахмылкай.

— А, гэта вы, Максім Леанідавіч! Чым магу быць карысным?

— Звягінцаў! Дзе ён?

— Капітан Звягінцаў, вы маеце на ўвазе?

— Як... капітан?! Мне патрэбен старшы лейтэнант... Звягінцаў.

— Ну, у нашым аддзеле Звягінцаў толькі адзін, і ад учорашняга дня ён капітан, так што, мяркую, вы шукаеце менавіта яго. На жаль, яго няма на месцы, ён з'ехаў па працы.

— Мая жонка, ён сёння арыштаваў маю жонку! Я хачу ведаць, на якой падставе і дзе яна цяпер!

— А, Тацціяна Віктараўна, калі не памыляюся? Так-так, сёння сапраўды арыштавалі такую. Прашу прабачэння, не магу вам нічога сказаць. Службовая тайна, вы ж разумееце, — і гэтая курва зноўку агаліла свае жоўтыя зубы ў крысінай пасмешцы.

— Дзе яна? Дзе мая жонка?!

— Вашая жонка, шаноўны настаўнік, этапавана па рашэнні пазасудовай тройкі для прыняцця пакарання згодна з артыкулам... Эй! Эй! А ну вярніся!

Я зноўку бег, не спыняючыся ні на секунду, але ўжо не адчуваў шалёнага сэрца. Тройка? Пакаранне? Таня! Танечка!!! Этапавалі... Канешне, яе адправілі кудысьці, але з ёй усё будзе добра, яна вернецца, жывая і здаровая. Этапавалі. Ці не ў лес?!

Я застагнаў ад гэтай думкі. Нееe! За што?!...

Лаз, той самы лаз пад плотам. Хутчэй!

У лесе гучалі стрэлы. Што, калі я спазніўся? Што, калі яна тут? Нее. Яна не тут... яна не тут. Не тут!

Я ўпаў на зямлю, папоўз, як змяя. Безумоўна, яна не тут, але я мушу сам, на свае вочы праверыць гэта, інакш мне ніколі не будзе спакою.

Я спыніўся толькі за дваццаць метраў ад расстрэльнай каманды. Падпаўзці бліжэй было б шаленствам нават для мяне. Мяне й так не заўважылі толькі дзякуючы таму, што чэкісты былі цалкам занятыя «выкананнем».

Я адшукаў вачыма Звягінцава. Гэтая курва не прымала ўдзелу ў самім расстрэле, ён толькі аддаваў загады, флегматычна назіраючы за працэсам. Яго́ныя рукі паціралі элегантны нямецкі «Вальтэр».

Яма была запоўненая ўжо амаль напалову. Нават са свайго месца я мог бачыць, што сярод расстраляных не было аніводнай жанчыны. У мяне нібыта скала звалілася з плячэй.

Мае вусны лічылі кожнага забітага. Іх колькасць блізілася ўжо да трыццаці. Па ўсім, хутка партыя павінна была скончыцца, яшчэ чалавек пяць, не больш. Божачкі, Божа, яе няма?

— Усё, таварыш капітан, — старшы з групы хутка адрапартаваў Звягінцаву. Ён казаў штосьці яшчэ, але я не чуў яго́ных слоў.

Яе няма тут! Няма! Яна жывая, яна будзе жыць! Будзе жыць, мая мілая, мая каханая!

— Застаўся толькі адзін кліент, — старшы панізіў голас. — Той самы.

Па маіх вушах нібыта молатам грукнулі халодныя словы Звягінцава.

які не хацеў быць богам

— Вывадзіце.

Цябе нават не вывалаклі — выштурхнулі з машыны. Ты білася, білася, як кацяня, на якое навалілася зграя шалёных сабак! Маё цела адмаўлялася падпарадкавацца мне. Перад вачыма паплылі чырвоныя плямы. Я сплю! Сплю! Гэтага проста не можа быць. Таня!

Капітан павольна падышоў да цябе, паглядзеў зверху ўніз, падняў нагу, нібыта з лянотай піхнуў. Ты пакацілася па бруднай зямлі, прыціскаючы свае маленькія ручкі да жывата. Ты нават не крычала ўжо, толькі ледзьве чутна ўсхліпвала, але я чуў усё.

Звягінцаў зноўку наблізіўся. Ён схапіў цябе за валасы і пацягнуў да ямы.

Раптам ты паглядзела ў мой бок. Вочы, твае самыя прыгожыя ў свеце зялёныя вочы, злавілі мяне пасярод высокай травы і маладых дрэваў і сачылі за мной.

Раптам сілы вярнуліся да майго цела. Я паспрабаваў падняцца на ногі, але твой спужаны погляд зноўку прыкаваў мяне да зямлі. Ён крычаў мне: «Не! Не!»...

— Тацցяна Віктараўна, вы ж верыце ў бога? Памаліцеся яму, я дазваляю! У вас роўна паўхвіліны, — ён падняў «Вальтэр» і рэзка ўзвёў курок.

Ты не чула яго. Ты не чула ані слова з таго, што ён казаў — ты толькі глядзела на мяне і моўчкі развітвалася са мной.

Хлоп!

Твае зрэнкі ўздрыгануліся, і я мільгануў у іх на секунду, толькі на секунду, каб застацца там на вечныя стагоддзі.

— Як твой бог, сука? Да сустрэчы ТАМ!

— Кахаю, — прашаптала ты і заплюшчыла вочы.

І не было ні болю, ні надзеі. У свеце панавала чорная цішыня.

Прачнуўся і загаманіў лес. Зноўку заспявалі птушкі. Недзе далей забрахалі сабакі. Забрахалі сабакі? Забрахалі сабакі!! Брэх гучаў дзесьці наперадзе. Што за?..

Я занадта позна зразумеў, што іду па ветру. Калі ў мінулыя разы я ішоў убок ад брамы супраць ветру, сабакі не адчувалі чужога паху. Цяпер жа...

Нечакана я зноў убачыў лаз. Убачыў нібыта ў тумане — зрок адмаўляўся мне падпарадкоўвацца, ногі таксама, але я ўсё роўна ішоў нібыта ў сне туды, дзе чарнела прагаліна на месцы праламаных дошак.

Стрэлу я нават і не пачуў. Куля раструшчыла дрэва на ўзроўні галавы справа ад мяне. Да лазу заставалася яшчэ нейкіх метраў пяць, калі я пачуў крыкі вартаўнікоў. На бліжэйшым кусце яшчэ адна куля зрэзала галінку... Я кінуўся на зямлю і папоўз на жываце да ратавальнага лазу.

Брэх сабак зноўку нагнаў мяне каля хаты дзеда Юрася. Пагоня дакацілася да вёскі, і цяпер пачыналі абшукваць хаты.

— Што за... — Стары пачаў было сварыцца праз тое, што яго паднялі на досвітку, але на паўслове яго скарга абарвалася. — Максім? Што з табой? Што здарылася? Дзе Таня?

— Таня не жыве!!!

— Што? Што ты вярзеш?!

Я не адказаў. Я проста пераваліўся за парог і ўпаў на падлогу.

— Хто? Хто забіў?! Хто забіў яе?!

Я адказаў адным толькі словам:

— Звягінцаў.

Стары закрычаў. Ён крычаў у ранішняе неба, ён слаў праклёны гэтаму небу, сонцу, Звягінцаву і ўсяму свету.

З боку расстрэльнага лесу ў вёску ўварваліся чатыры чорныя варанкі. Хату абкружылі.

Стары зачыніў дзверы на замок, схапіў лом і адарваў ад падлогі чатыры дошкі. Пад імі была неглыбокая яма, у якой ляжала штосьці доўгае, загорнутае ў тканіну. Пад тканінай я ўбачыў тры вінтоўкі.

Цішыня стаяла з хвіліну. Потым на двары мы пачулі хуткія і ўпэўненыя крокі.

— Ад імя савецкай улады я загадваю вам адчыніць дзверы і даць супрацоўнікам Камісарыята арыштаваць злачынцу, — добра знаёмы голас адразу прабраў марозам да самых касцей.

— Тваё імя! — прагрымеў голас старога.

— Я паўтараю...

— Тваё, курва, імя!!!

— Капітан Камісарыята ўнутраных спраў Звягінцаў.

Гэтага было дастаткова. Дзед выбіў ствалом вінтоўкі шкло ў вакне і стрэліў.

— Па вокнах плі!

Я нават не паспеў націснуць на курок, як рэзкі боль адкінуў мяне ад вакна. Плячо было прастрэлена, з яго біла кроў.

Дзед Юрась высунуўся ў акно, каб адшукаць Звягінцава, і раптам схапіўся за грудзі ды апліў на падлогу.

— Вось... і ўсё, сынку... — ён расцягнуў вусны ў змучанай усмешцы. — Я б... хацеў быць... богам... каб іх... — ён закашляўся, на вуснах з'явілася кроў. — Іх... на нашае месца...

Дні ў раённым аддзяленні Камісарыята нічым не адрозніваліся ад начэй. Тут заўсёды было цёмна, пахла сырасцю, крывёй і дымам. А яшчэ тут былі пацукі. Шмат пацукоў — цэлае пацучынае войска маршыравала па падлозе падземных камераў. Пацукі не нападалі на жывых вязняў — яны былі сытыя, бо маглі пачаставацца тымі, каму было ўжо ўсё роўна.

Допыты цягнуліся бясконца, адзін за адным. Змяняліся следчыя, змяняліся ахоўнікі. Нязменным было толькі пачуццё поўнай пустэчы. Так, я не адчуваў абсалютна нічога: ні болю, ні страху, ні жалю. Мяне білі, а я не заўважаў гэтага. Часам мне падавалася, што я памёр, і мая душа аднекуль зверху назірае за тым, як нястомныя ката чамусьці працягваюць здзекавацца з мёртвага цела.

Я згубіў лік часу. Для мяне было абсалютнай тайнай, колькі я быў тут ужо — дзень, месяц, год альбо стагоддзе.

Памятаю, калі я ўпершыню абудзіўся тут, я папрасіў следчага — маладога хлопца маіх гадоў з абыякавым выразам на твары — паклікаць маёра Раманава. Той падняў галаву ад сваіх папераў і крыху здзіўлена запытаўся:

— Раманава? Маёр Раманаў выбыў ужо два тыдні таму.

— Выбыў? Што гэта значыць?

— Быў зняты з пасады і расстраляны...

Увесь час мне задавалі нейкія пытанні, сэнсу якіх я не мог зразумець. Здаецца, мяне вінавацілі ў злачынствах супраць Саветаў, шпіянажы...

Я не чакаў смерці як вызвалення. Я нічога не чакаў, як нічога не адчуваў. Бог быў там, наверсе, і ён назіраў за ўсім, што са мной адбывалася. Я не хацеў быць богам. Я б не змог быць такім бессардэчным, якім павінен быць Бог.

Праз тыдзень — ці тысячагоддзе? — мяне ў чарговы раз вывалаклі з камеры, каб адвесці на допыт. Кабінет следчага, у якім я ведаў кожны міліметр падлогі, у якім на кожнай сцяне былі сляды маёй крыві, быў незачынены. За сталом сядзеў хтосьці, каго я яшчэ ні разу не бачыў на сваіх допытах. Гэты чалавек, апусціўшы галаву, чытаў нейкія дакументы, якія ляжалі перад ім.

Канваіры пасадзілі мяне на цвёрды стул, нехта адрапартаваў:

— Савіцкага прывялі, таварыш капітан.

Ах вось яно што! Чарговы следчы быў нікім іншым, як самім Звягінцавым. Прывітанне, гад, даўно не бачыліся!

Забойца падняў галаву і з усмешкай паглядзеў на мяне.

— Ну як вашыя справы, Максім Леанідавіч? Чуў, што вы ніяк не жадаеце праявіць разуменне і пасупрацоўнічаць са следствам. Гэта нявеглівa з вашага боку! Бачыце, нават мяне ад працы адарвалі, каб я з вамі паразмаўляў... Мне тут казалі, што ты, сука, нібыта, не баішся болю і біць цябе не мае аніякага сэнсу. Можа быць, я не буду правяраць, мне ўсё роўна. Хачу, каб ты разумеў: у мяне вельмі мала часу, сам ведаеш, палігон чакае, — ён зноўку ўсміхнуўся. — З гэтай нагоды я не буду расцягваць бясспрэчную радасць ад размовы з табой, ты падпішаш пратакол, які павінен быў падпісаць яшчэ тыдзень таму, і мы з табой назаўсёды развітаемся. Як табе такі варыянт?

— Паршыва. Твае, капітан, выблядкі так і не змаглі мне растлумачыць сутнасць усіх абвінавачванняў. — Я закашляўся.

Капітан схапіў мяне за валасы і прыпячатаў галавой да сталешніцы. Па шэрым метале расплылася цёмначырвоная пляма.

Звягінцаў схапіў са стала дакументы, якія ён вывучаў да майго з'яўлення, і падсунуў мне пад нос:

— Распавяду табе адну цікавую гісторыю. Наколькі я ведаю, ты ўсюды казаў, што не ведаеш свайго бацьку, табе пра яго ніколі не распавядалі і сам ён памёр яшчэ да твайго нараджэння. Гэтым казкам верылі, праверыць усё роўна не было аніякай магчымасці. А некалькі месяцаў таму я ўдзельнічаў у арышце аднаго старога, якога вінавацілі ва ўзброенай барацьбе супраць савецкай улады. У ягонай хаце мы знайшлі досыць цікавыя дакументы і фотаздымкі. Паглядзі сюды, — і ён ткнуў пальцам у нейкую паперу.

Я прагледзеў дакумент. Наколькі зразумеў, гэта было штосьці накшталт узнагароднага ліста. Дзясятым у спісе стаяла прозвішча... Савіцкага Леаніда Мікалаевіча!

— Ён быў асабістым ад'ютантам вядомай гніды, якую ягоныя шаўкі звалі генералам Булак-Балаховічам!.. — капітан гагатнуў. — Цэлы стос дакументаў гэтага злачынцы захаваўся ў схроне, які ён зладзіў наўпрост у сваёй хаце. А цяпер глянь сюды, — і Звягінцаў падштурхнуў да мяне жоўты фотаздымак. На ім я ўбачыў шмат людзей у вайсковай форме, якія абкружылі маладога мужчыну з чорнымі вусамі, георгіеўскім крыжом і яшчэ нейкімі ўзнагародамі, якія я не пазнаў.

Звягінцаў ткнуў пальцам у самы кут фотаздымка, на аднаго з вайскоўцаў, які стаяў асобна.

— Паглядзі! Не пазнаеш?

Я пазнаваў. З фотаздымка на мяне глядзеў... нібыта я сам!..

Перада мной ляжалі паперы, якія я мусіў падпісаць. Я адсунуў пратакол.

— Ну і як гэта разумець? — спакойна спытаў капітан.

— Падавіся ты, гад. Колькі б ты мяне не біў, колькі б не ламаў касцей і не зрываў скуры з мяса, я нічога не падпішу. Якая мне розніца, калі ты ўсё роўна загадаеш расстраляць мяне. Можа быць там, наверсе, я зноўку буду з маёй Таццянкай? Хто ведае, можа быць, мы вернемся на зямлю, вернемся, каб адпомсціць табе і табе падобным. Даставай свой «вальтэр», забі мяне, як забіў яе.

Звягінцаў сапраўды дастаў «вальтэр». Але ён не стаў страляць. Ён толькі размахнуўся і ўдарыў мяне па галаве. Я паваліўся ў цемру...

А калі праз дзве гадзіны расплюшчыў вочы, капітан сядзеў насупраць і з нязменнай усмешкай разглядаў паперы, якія я адмовіўся падпісаць.

— Добрай раніцы, Максім Леанідавіч! Паглядзі сюды, — і ён зноў сунуў мне пратакол.

Я не верыў сваім вачам: мой подпіс стаяў пад дакументам.

— Цікава, праўда? Ну вось што перашкаджала мне адразу самому паставіць за цябе твой подпіс? Узор у мяне быў, а разбірацца ніхто не будзе, гэта я гарантую. Мог бы не марнаваць некалькі гадзінаў, — ён зарагатаў. — Ты ведаеш, я ж хацеў табе аказаць адну паслугу. Калі б ты падпісаў паперу сам, ты б сапраўды атрымаў па-хуценьку мяму кулю ў патыліцу. Хто ведае, а раптам ТАМ ты б сапраўды сустрэў сваю суку, а? — Ён зноўку зарагатаў. — А так... ты не пажадаў супрацоўнічаць, гэта заўсёды караецца вельмі жорстка. Шмат хто лічыць, што самае страшнае пакаранне, якое можа прызначыць Камісарыят, гэта расстрэл. Глупства. У мяне тут ёсць два аркушы. На іх два варыянты прысудаў для цябе. Абодва яны могуць быць правамоцнымі пасля таго, як я пастаўлю свой подпіс. Такім чынам... — ён выцягнуў адзін аркуш. — Першы прысуд: «Савіцкаму Максіму Леанідавічу прызначыць пакаранне ў выглядзе расстрэлу». Другі прысуд... так, так, а вось, тое што трэба: «...прызначыць пакаранне ў выглядзе пажыццёвага зняволення ў сістэме папраўчых лагераў Савецкага Саюза, без права амністыі, без права ліставання, без права...». Тут яшчэ шмат без якога права, прасцей для цябе будзе зразумець, што ад гэтага моманту ў цябе няма права ні на што абсалютна. Такім чынам, што ж мне абраць... — Ён тэатралізавана задумаўся. — Думаю, што такога лёгкага пакарання, як расстрэл, ты не заслужыў, — ён парваў першы аркуш. Пад другім жа паставіў подпіс і адклаў яго ў планшэт.

Вагон быў халодны і сыры. Як і ў камеры, тут было шмат пацукоў. Але ў адрозненне ад тых, турэмных, гэтыя былі галоднымі...

Нам не казалі, куды рухаецца этап. Мы не павінны былі гэтага ведаць. Адгэтуль мы не павінны былі ведаць нічога. Мы былі нікім, і імя нам было ніхто. Адзінае, што мы ведалі — мы больш не людзі. Нам нельга было размаўляць, нельга было скардзіцца, нельга прасіць.

У вагоне нас такіх было чалавек семдзесят. Як шапнуў адзін з вязняў, нам яшчэ пашанцавала: чэкісты перавозілі ў такіх вагонах і па дзвесце чалавек. Але мне было ўсё роўна. Для мяне навокал не было больш нікога — толькі душы пакутнікаў, яшчэ не мёртвых, але ўжо й не жывых.

А яшчэ са мной побач былі мае анёлы. Ты, мая мілая, і дзед Юрась. Вы кожны вечар былі са мной, вы шапталі мне ласкавыя словы, вы суцяшалі мяне. Толькі вы былі рэальнымі, усё ж астатняе, што я бачыў навокал: сцэны вагона, канвойных, вязняў, — яны былі прывіднымі, ілюзорнымі, ненатуральнымі. Я нібыта бачыў гэта ўсё ў сне і, як і ў сне, спакойна назіраў, нібыта ведаючы, што сон рана ці позна скончыцца, што я расплюшчу вочы, а навокал мне будуць зычыць добрай раніцы мае родныя, мае дарагія, мае светлыя. І хоць сон будзе доўжыцца шмат страшных гадоў, я не хваляваўся.

Усё ж такі Звягінцаў не перамог. Ён хацеў, каб я пражыў доўгае жыццё, поўнае пакутлівай рэальнасці і балючых успамінаў. Ён памыліўся толькі ў адным: больш не было жыцця. Было існаванне, быў толькі сон, а без жыцця пакуты не маюць аніякага сэнсу — іх нельга адчуваць. І я ўсміхаўся начамі, калі мяне ніхто не бачыў, усміхаўся ад адной гэтай думкі — што хоць у чымсьці я перамог д'ябла.

Я бачыў наперадзе доўгія дзесяцігоддзі, бачыў гэтак жа ясна, нібыта ўжо пражыў іх і ведаў, што чакае маю краіну. Я не баяўся нічога. Я толькі чакаў...

(Тэкст друкуецца ў скароце.)

Далёка ад родных нябёсаў



Уладзімір АРЛОЎ

Адсутнасць сваёй дзяржавы, каланіяльны стан краю наканаваў шматлікім адораным разнастайнымі талентамі ліцьвінам-беларусам служыць не сваёй культуры: ствараць кнігі, займацца гісторыяй, філалогіяй, педагогікай. Мы ведаем пра геніяльнага Адама Міцкевіча, які называў сваю радзіму Літвой, высока цаніў беларускую мову, але мусіў пісаць па-польску. У гэтым апавяданні пойдзе гаворка пра іншых творцаў, а таксама пра вучоных-гуманітарыяў , якія пакінулі сваю важкую спадчыну суседнім, а часам і далёкім народам і краінам. Разам з тым дасягненнямі суайчыннікаў маем права ганарыцца і мы, беларусы.

Слуга музы Кліо

У антычных міфах згадваюцца музы — багіні, шанаваныя як апякункі навук і мастацтваў. Музай гісторыі сярод дзевяці сясцёр была Кліо. Верным слугой Кліо любіў называць сябе выпускнік Полацкай езуіцкай Акадэміі народжаны ў мястэчку Падароск Ваўкавыскага павета Максімілян Рыла.

У 1820 годзе цар Аляксандр I выдаў указ пра высылку сяброў Таварыства Ісуса з Расейскай імперыі і закрыцці ўсіх езуіцкіх навучальных установаў, якія былі самымі перадавымі для свайго часу. Высланцамі сталі болей чым трыста выкладчыкаў, навукоўцаў, святароў. Радзіму пакінуў і малады магістр філасофіі Рыла. Ён працягваў навучанне ў Папскім універсітэце ў Рыме і стаў там прафесарам.

Як давераная асоба Ватыкана Максімілян наведаў Ліван, Сірыю, Егіпет, Мальту і Сіцылію. Паўсюль ён, апрача дзейнасці прапаведніка і місіянера, займаўся археалагічнымі росшукамі. Рыла першы з еўрапейцаў вывучаў руіны Вавілона. Ён сабраў і падараваў Ватыканскаму музею вялікую калекцыю сваіх знаходак і быў абраны ў Папскую археалагічную акадэмію. У сталіцы Лівана горадзе Бейруце прафесар Рыла заснаваў каталіцкі калегіюм, што па часе стаў універсітэтам. Жыццёвы шлях Максіміліяна заўчасна абарваўся ў час місіянерскай вандроўкі ў Судан, а пахавалі прафесара ў Каіры.

«Клянуся Зеўсам, Зямлёю, Сонцам...»

У раскрыцці таямніцаў далёкай гісторыі вызначыўся яшчэ адзін ліцьвін-беларус — Кароль Касцюшка-Валюжыніч родам з Дрысенскага павета Віцебскай губерні. Маёнтак ягонага бацькі Новае Сяло месціўся побач з мястэчкам Друя. Пра сваё паходжанне народжаны ў 1847 годзе Кароль пісаў: «Не хаваю ліцьвінскай нацыянальнасці і рымска-каталіцкага веравызнання».

Дзед будучага вучонага ваяваў пад сцягамі Тадэвуша Касцюшкі, а бацька падтрымліваў



Кароль Касцюшка-Валюжыніч. Здымак канца XIX – пачатку XX ст.

змагароў 1863 года. Успаміны пра тыя падзеі часта гучалі ў сямейным коле і фармавалі светапогляд Тадзіка. Старадаўняя Друя з велічным Траецкім касцёлам і недалёкі Полацак, дзе Кароль часта бываў з бацькамі, рана нарадзілі ў хлопчыка схільнасць да гісторыі. Асабліва ўражваў яго авеяны легендамі Сафійскі сабор — сведка нашай даўняй дзяржаўнасці і культуры.

Вучыцца Караля выправілі на падрыхтоўчае аддзяленне Пецярбургскага Горнага нстытута, які забяспечваў выпускнікам добрыя пасады і заможнае жыццё. Аднак начальства звярнула ўвагу на вольналюбівая погляды навучэнца. Апрача таго ён даводзіўся сваяком правадыру антырасейскага паўстання 1794 года... Юнаку давялося вярнуцца ў бацькаў маёнтак і ўладкавацца працаваць на чыгунку. Жыццё склалася так, што з прычыны цяжкай хваробы лёгкіх дактары параілі Каралю памяняць клімат на крымскі, і ён набыў дом у Севастопалі.

Крым, дзе некалі існавалі антычныя гарады, нездарма называлі «залатым дном для гісторыкаў». Касцюшка-Валюжыніч вырашыў, што далучыцца да пошуку старажытных помнікаў. Ён заснаваў гурток аматараў гісторыі Крыма, пры якім дзейнічалі музей і бібліятэка. З таго часу галоўнаю справай для Караля сталі раскопкі колішняга грэцкага Херсанеса, што стаяў на месцы Севастопаля. Гэтым росшукам ён аддаў дваццаць гадоў жыцця.

Касцюшка-Валюжыніч адкрыў антычныя храмы, муры і гарадскую браму, скляпы з залатымі і срэбнымі ўпрыгожваннямі. Самай значнай знаходкай стала мармуровая стэла з прысягаю жыхароў Херсанеса III стагоддзя да нашай эры. На думку гісторыкаў, гэтая клятва роднаму гораду паўнатой свайго зместу і літаратурнымі вартасцямі перасягае прысягу афінянаў.

Археолаг з Дрысеншчыны стварыў Музей старажытнага Херсанеса і быў яго першым дырэктарам. Сучасныя студэнты-гісторыкі, якія прыязджаюць у Крым на археалагічную практыку, паводле даўняй традыцыі прамаўляюць каля магілы Караля Касцюшкі-Валюжыніча словы адкрытай ім прысягі: «Клянуся Зеўсам, Зямлёю, Сонцам, багамі, багінямі і героямі алімпійскімі, што не здраджу Херсанесу...».

Прататып адваката Фецюковіча

Уклад у гістарычную навуку XIX стагоддзя зрабіў і рэчыцкі нараджэнец, выпускнік Менскай гімназіі Уладзімір Спасовіч. Ён займаўся мінулым заходнееўрапейскіх і славянскіх краін, падрыхтаваў да выдання Статуты Вялікага Княства Літоўскага (іх забаранілі друкаваць у сувязі з паўстаннем 1863 года).

З-пад пяра Спасовіча, які быў адным з заснавальнікаў Варшаўскага навуковага таварыства і ганаровым доктарам Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве, выйшлі працы па гісторыі літаратуры, у тым ліку прысвечаныя Адаму Міцкевічу і Уладзіславу Сыракомлю.

Спасовіч атрымаў дыплом юрыдычнага факультэта Пецярбургскага ўніверсітэта, загадваў там катэдрай крымінальнага права і напісаў адзін з найлепшых падручнікаў па гэтай дысцыпліне. Праславіўся і як адзін з самых паспяховых адвакатаў Пецярбурга і Варшавы. Узгадайце ягонае імя, калі будзеце чытаць раман Фёдара Дастаеўскага «Браты Карамазавы». Уладзімір Спасовіч — прататып адваката-беларуса Фецюковіча.

«Над Нёманам» і «Кароль у Нясвіжы»

Беларусь «падаравала» — найперш Польшчы і Расеі — шмат знакамітых пісьменнікаў. Паміж іх былі тыя, хто ўсведамляў сябе не расейцамі і не палякамі, а ліцьвінамі-беларусамі, аднак воляю лёсу здабылі прызнанне на чужыне.

Беларуская рэчаіснасць, жыццё сялянаў і шляхты, падзеі 1863–1864 гадоў адлюстраваліся ў прозе польскай пісьменніцы Элізы Ажэшкі. Непарыўна звязаны з нашай зямлёю сюжэтам ды вобразамі і раман «Над Нёманам» — вяршыня творчасці Ажэшкі. Яна нарадзілася паблізу Горадні, а затым доўгі час жыла ў гэтым горадзе. Сёння там працуе яе дом-музей, ёсць вуліца Ажэшкі і помнік пісьменніцы. Вялікімі тыражамі выдаюцца яе кнігі ў перакладзе на беларускую мову.

З беларускага роду выводзіў сваё паходжанне польскі пісьменнік, аўтар амаль 600 тамоў твораў Язэп Крашэўскі. За такое дасягненне літаратара ўнеслі ў Кнігу рэкордаў Гінэса, дзе яго называюць «чэмпіёнам прыгожага пісьменства эпохі гусінага пяра». Магчыма, вы ўжо чыталі пераўвасобленыя па-беларуску гістарычныя аповесці Крашэўскага «Кароль у Нясвіжы», «Апошнія хвіліны князя ваяводы (Пане Каханку)», «Маці каралёў» (пра жонку Ягайлы Соф'ю Гальшанскую), «Апошняя з слуцкіх князёў» (пра асветніцу і святую Сафію Слуцкую).

Нямцэвіч, Мілаш, Апалінэр

Ліцьвінамі-беларусамі былі бацькі польскага літаратара, аўтара раманаў, п'ес, вершаў і перакладаў Юльяна Нямцэвіча. У 1794 годзе Нямцэвіч стаў ад'ютантам і сакратаром Тадэвуша Касцюшкі. Яны разам адбывалі зняволенне ў Петрапаўлаўскай фартэцы, а потым выехалі ў ЗША. Юльян напісаў кнігу-біяграфію першага прэзідэнта гэтай краіны Джорджа Вашынгтона, якога ведаў асабіста. З-пад пяра Нямцэвіча выйшлі падарожныя нататкі, успаміны, гістарычныя нарысы, дзе апісаныя беларускія гарады, жыццё і побыт сялянаў.

Мястэчка Чарэя, што недалёка ад Чашнікаў, — радзіма выдатнага французскага паэта Оскара Мілаша. Далёка ад беларускіх краявідаў ён пісаў, што часта бачыць у снах старадаўнюю Траецкую (Белую) царкву на беразе вялікага і прыгожага Чарэйскага возера. Цяпер у тых мясцінах адбываюцца міжнародныя фестывалі музыкі і мастацтва.

З беларускага рода Кастравіцкіх — класік французскай паэзіі Гіём Апалінэр. Маёнтак ягоных



Гіём Апалінэр

продкаў канфіскавалі за ўдзел у паўстанні 1863 года, і дзед будучага творцы выехаў за мяжу.

Ахрышчаны ў гонар Касцюшкі

У Расеі праславіўся як літаратар Фадзей (Тадэвуш) Булгарын. Ягоны бацька меў маёнтак у Менскім павеце, змагаўся ў шэрагах касцюшкаўцаў і даў сыну імя ў гонар паўстанцкага правадыра. Пасля сібірскай высылкі Булгарын-старэйшы выхоўваў сына ў «сармацкім духу»: уранні будзіў яго стрэламі з пісталета або сцюдзёнай вадой, рана навучыў ездзіць конна і абыходзіцца са зброяй, на некалькі дзён браў з сабой на паляванні. Такая загартоўка спатрэбілася Тадэвушу, калі ён ваяваў у Вялікай арміі Напалеона. За гераізм Булгарын асабіста ад французскага імператара атрымаў званне капітана і стаў кавалерам ордэна Ганаровага легіёна.

Першыя творы Тадэвуш Булгарын пісаў і друкаваў па-польску. Настала пасяліўшыся ў Пецярбурзе, ён перайшоў на мову імперыі і хутка апынуўся ў ліку самых папулярных пісьменнікаў, журналістаў і выдаўцоў. Стварыў першы ў Расеі тэатральны альманах, заснаваў літаратурна-палітычную газету «Паўночная пчала».

Булгарын выдаў цэлую бібліятэку ўласных твораў. Найвялікшы поспех напаткаў ягоны раман «Іван Выжыгін». Ён тройчы перавыдаваўся ў Расеі і быў перакладзены на пяць еўрапейскіх моваў. У літаратуры нашых усходніх суседзяў менавіта Булгарын — заснавальнік жанраў авантурнага і фантастычнага раманаў. Тым часам пісьменнік не парываў сувязяў з радзімаю бацькоў. У сваіх творах ён шмат разоў згадваў беларусаў і Беларусь, смела называючы яе «крайнай».

З даўніх ліцьвінскіх родаў

Беларусы з паходжання — расейскія пісьменнікі Фёдар Дастаеўскі, Іван Бунін (з роду Бунікоўскіх), Аляксандр Грыбаедаў (з роду Грыбоўскіх), Фёдар Глінка, Аляксандр Грын (сын высланага каліноўца Стэфана Грынеўскага).

А ці ведаеце вы, што продкі нянькі Аляксандра Пушкіна — прыгоннай сялянкі Арыны Радзівонаўны — былі высланыя з-пад Кобрына за падтрымку вызвольнага паўстання Касцюшкі? Тут дарэчы нагадаць, што беларускія казкі, якія паэт слухаў у дзяцінстве, — адны з найбагацейшых па сваіх сюжэтах у Еўропе.

Дагэтуль малавядомая і такая цікавая рэч: словы да дзіцячай навагодняй песні «В лесу родилась ёлочка» сто дваццаць гадоў таму напісала нашая суайчынніца Раіса Гедройц, якая служыла ў Маскве гувернанткай...

Зоркі першай велічыні

Беларускія таленты спрычыніліся да развіцця ў Расеі тэатральнага і музычнага мастацтва.

З Шклоўскага прыгоннага тэатра царскага вяльможы Сямёна Зорыча ў Пецярбург перавялі чатырнаццаць самых таленавітых артыстаў і артыстак. Балярыны сёстры Кацярына і Пелагея Азарэвіч сталі зоркамі першай велічыні на пецярбургскай і маскоўскай сцэнах.

Дочкі Кацярыны — Надзея і Марыя — таксама бліскуча выступалі ў балетных і драматычных спектаклях сталічных тэатраў. Марыя першай выканала ролю Лізы ў пастаноўцы камедыі «Гора ад розуму» паводле п'есы Аляксандра Грыбаедава.

Пасаду «дырэктара музыкі» пецярбургскіх імператарскіх тэатраў тады займаў кампазітар Восіп Казлоўскі, беларускі шляхціц з Мсціслаўшчыны. Некалі ён даваў урокі юнаму Міхалу Клеафасу Агінскаму, а пазней выдаваў ягоныя музычныя творы. Казлоўскі — адзін з пачынальнікаў жанру расейскага рамансa. Ён напісаў паланэз «Гром победы, раздавайся», што нейкі час лічыўся гімнам імперыі.

Натхняліся беларускімі мелодыямі

Вёска Наваспаскае ў цяперашнім Ельнінскім раёне Смаленшчыны — радзіма заснавальніка расейскай класічнай музыкі Міхаіла Глінкі. Яшчэ ў 1970-я гады старэйшыя жыхары Наваспаскага — аўтар гэтых радкоў чуў на свае вушы — гаварылі на цудоўнай беларускай мове.

Глінка стварыў оперы «Иван Сусанин» і «Руслан і Людміла», раманс «Я помню чудное мгновенье», якімі ганарыцца культура ўсходніх суседзяў Беларусі.




Міхаіл Глінка. Патрэт А. Гараўскага

Праўда, расейцы звычайна «забываюць» адзначыць, што творчасць кампазітара заўсёды несла ў сабе водгук беларускіх народных песняў. Менавіта ў мясцінах дзяцінства Міхаіл Глінка запісаў мелодыю славутай «Камарынскай».

З беларускіх родаў паходзілі кампазітары Мадэст Мусаргскі і спявак, зорка пецярбургскага Марыінскага тэатра Фёдар Стравінскі. Ягоны сын Ігар здабудзе славу аднаго з найвыдатнейшых кампазітараў XX стагоддзя. Знакаміты дзеяч музычнага мастацтва Дзмітрый Шастаковіч — унук паўстанца 1863 года.

Заходнія суседзі Беларусі лічаць «бацькам польскай оперы» Станіслава Манюшку. Дзіцячыя і юначыя гады будучага кампазітара прайшлі ў мястэчку Убель Ігуменскага павета (цяпер у Чэрвеньскім раёне) і ў Менску. Манюшка быў пачынальнікам і нашага опернага мастацтва: паставіў на менскай сцэне ў суаўтарстве з пісьменнікам Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам оперу «Сялянка». Пражыўшы другую частку жыцця ў Варшаве, Станіслаў Манюшка часта нат-



Станіслаў Манюшка

хняўся роднымі яму з малых гадоў беларускімі мелодыямі.

Польскі кампазітар і дырыжор Мечыслаў Карловіч, якога называюць пачынальнікам польскай сімфанічнай музыкі, родам з Смаргоншчыны. Сімфанічная паэма Карловіча «Літоўская рапсодыя» заснаваная на беларускіх народных песнях, а ў паэме «Адвечныя песні» выразна гучаць мелодыі беларускіх жалобных спеваў.


«Махабхарата» і японскі слоўнік

Беларусь дала тагачаснай навуцы шмат таленавітых мовазнаўцаў.

Палачанін, сын вуніяцкага святара і выхаванец Полацкай вышэйшай піярскай вучэльні Каятан Касовіч стаў першым у Расеі санскрытолагам — знаўцам санскрыту (даўняй літаратурнай мовы Індыі). Ён склаў санскрыта-расейскі слоўнік і пераклаў адзін з найкаштоўнейшых твораў сусветнай літаратуры — індыйскую «Махабхарату».

Касовіч займаўся перакладамі з старажытных грэцкай, персідскай і габрэйскай моваў. Ён быў праўдзейным сябрам французскіх, нямецкіх і англійскіх навуковых таварыстваў. Персідскі шах адзначыў Касовіча адной з самых высокіх узнагародаў сваёй дзяржавы — ордэнам Льва і Сонца. Наведваючы ў Лондане праслаўлены Брытанскі музей, дасведчаны палачанін звярнуў увагу яго супрацоўнікаў на тое, што асірыйскія клінапісныя таблiцы вісяць у іхняй экспазіцыі дагары нагамі.

У сям'і вуніяцкага святара нарадзіўся і Язэп Гашкевіч родам з Рэчыцкага павета. Гэты выпускнік Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі даследваў культуру Кітая, Карэі ды Японіі, выдаў першы японска-расейскі слоўнік. Ён стаў першым расейскім консулам у Японіі, а таксама адным з першых іншаземцаў, каму японскія ўлады



Бюст Язэпа Гашкевіча ў Астраўцы

дазволілі наведаць унутраныя раёны краіны. Калекцыі флоры і фаўны, сабраныя ў вандроўках, Гашкевіч падараваў заалагічнаму музею ў Пецярбурзе.

Імя нашага земляка ўвекавечанае ў назвах затокі ў Паўночнай Карэі і вуліцы ў Менску. Помнікі Язэпу Гашкевічу ўсталяваныя ў горадзе Хакадатэ на японскім востраве Хакайда і ў беларускім Астраўцы, паблізу якога стаяў маёнтак, дзе вучоны пражыў апошнія гады. Пісьменнік Васіль Гузаваў выдаў пра Гашкевіча дакументальную аповесць «Адысей з Беларусі».


Бацька філолага і гісторыка Восіпа Кавалеўскага служыў святаром у вуніяцкай царкве на Гарадзеншчыне. Такое паходжанне яшчэ раз сведчыць, што вуніяцкае асяроддзе вельмі часта давала адукаваных асобаў з шырокім кругаглядам і здольнасцю сказаць сваё слова ў навуцы і культуры.

З сям'і святара-вуніята з Віцебшчыны выйшаў і расейскі філосаф Мікалай Лоскі.

Восіп Кавалеўскі і Эдвард Пякарскі

За прыналежнасць да філаматаў і філарэтаў Восіпа Кавалеўскага выключылі з Віленскага ўніверсітэта і выслалі ў Казань. Там ён дасягнуў поспехаў у вывучэнні ўсходніх моваў і асабліва зацікавіўся мангольскай. Малады навуковец шмат падарожнічаў па Манголіі ды Кітаі і вярнуўся ў Казанскі ўніверсітэт з казачна багатым зборам рукапісаў на мангольскай, тыбецкай, кітайскай і маньчжурскай мовах. Ён выдаў граматыку мангольскай мовы, мангольска-расейска-французскі слоўнік, «Мангольскую хрэстаматыю». Кавалеўскага абралі акадэмікам Пецярбургскай акадэміі навук, а затым — рэктарам Казанскага ўніверсітэта.

Этнографа, географа і фалькларыста Эдварда Пякарскага, які нарадзіўся ў Ігуменскім павеце, лічаць «бацькам якуцкай літаратуры». За ўдзел у руху рэвалюцыянераў-народнікаў Пякарскага адлічылі з інстытута



Эдуард Пякарскі

без права паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Яго выслалі ў Якуцію, дзе давялося пражыць дваццаць гадоў. Навуковы склад розуму Пякарскага не дазваляў яму сядзець без справы. Ён заняўся вывучэннем якуцкіх традыцый і абрадаў, казак і песняў. Але галоўным клопатам стала складанне першага ў гісторыі слоўніка якуцкай мовы. У гонар Эдуарда Пякарскага ў Якуцку названыя вуліца і школа, створаны яго музей. Урад сучаснай Рэспублікі Саха (Якуціі) заснаваў стыпендыі імя Пякарскага і выдзеліў грошы на рэстаўрацыю ягонага паўразбуранага надмагільля ў Пецярбурзе. Мясцовыя чыноўнікі помнікам славутаму беларусу не цікавіліся…

У падмурак Адраджэння

Выпускнік Магілёўскай духоўнай семінарыі Іван Насовіч супрацоўнічаў з Пецярбургскай Акадэміяй навук і Расейскім геаграфічным таварыствам, выконваў іх замовы і ганараваўся высокімі прэміямі. Ён склаў першы гістарычны слоўнік беларускай мовы на 13 тысяч слоў, зборнікі прыказак і прымавак, народных песняў, легендаў і баек. У гэтым дапамагалі шматлікія падарожжы па родным краі.

Галоўная праца Івана Насовіча, якая прынесла яму ўдзячную памяць суайчыннікаў, — выдадзены ў 1870 годзе «Слоўнік беларускай мовы». Туды ўвайшло болей за 30 тысяч слоў, запісаных самім аўтарам у Віцебскай, Магілёўскай, Менскай і Гарадзенскай губернях, а таксама ўзятых з даўніх помнікаў пісьменства і вуснай народнай творчасці.

Праца Насовіча — з тых, што леглі ў падмурак беларускага



Іван Насовіч

Адраджэння. Слоўнік перавыдадзены пры канцы XX стагоддзя і дагэтуль лічыцца ўнікальным зборам айчыннай лексікі.

Настаўнік настаўнікаў

Шмат хто з вас, відаць, чуў пра знакамітага педагога Канстанціна Ушынскага. Паводле апошніх звестак, гэты асветнік і заснавальнік педагагічнай навукі ў Расеі нарадзіўся не ў Туле (так сцвярджаюць расейскія даведнікі і энцыклапедыі), а ў сям'і беларускага шляхціча пад Маладзечнам.

У сваіх педагагічных кнігах, падручніках і артыкулах Ушынскі падкрэсліваў: школа павінна не толькі падрыхтаваць чалавека да жыцця і працы, але і выхаваць пачуцці патрыятызму, абавязку перад народам. Ён лічыў, што ў выхаванні дзяцей велізарную ролю адыгрывае сям'я. Вялікую ўвагу Ушынскі надаваў мове навучання і быў перакананы, што кожны народ мае права мець школу на роднай мове.

Настаўніку настаўнікаў, як называлі Ушынскага, належаць мудрыя словы-папярэджанне: «Калі вымерла мова ў вуснах народа, вымер і народ».

Уявіце, колькі зрабіў бы для свайго народа Канстанцін Ушынскі, калі б тады існавалі беларуская дзяржава і адукацыя на беларускай мове…

***

…У 1897 годзе ў Расейскай імперыі адбыўся першы ўсеагульны перапіс насельніцтва. Апытанне пра нацыянальнасць не праводзілася, але перапісчыкі павінны былі высветліць родную мову жыхароў. 5 мільёнаў 711 тысяч чалавек назвалі роднай мовай беларускую. Бальшыня з іх жыла ў Віленскай, Гарадзенскай, Менскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях. Некалькі сотняў тысяч беларусаў налічвалася ў Смаленскай, Чарнігаўскай і Ковенскай губернях. У «Северо-Западном крае» — так афіцыйна менавалі Літву-Беларусь імперскія ўлады — пра беларускую мову як родную заявілі звыш 50 працэнтаў шляхты, 60 працэнтаў настаўнікаў, 40 працэнтаў чыноўнікаў. Гэта сведчыла, што каланізатары, нягледзячы на ўсе намаганні, не здолелі ператварыць нашых продкаў у расейцаў. З кожным годам колькасць беларусаў няўхільна расла.

У XX стагоддзе былыя Літва і ліцьвіны ўступілі ўжо як Беларусь і беларусы. Мацнела беларускае нацыянальнае Адраджэнне. Першая сусветная вайна, што пачалася ў 1914-м, прывяла да краху Расейскую, Аўстра-Вугорскую, Нямецкую і Асманскую імперыі. Гэта спрыяла вызваленню паняволеных народаў.

25 сакавіка 1918 года была абвешчаная незалежнасць Беларускай Народнай Рэспубліцы. Бальшавікі знішчылі БНР, ды перамагчы ідэю нашай дзяржаўнасці яны не змаглі. Да сапраўднай незалежнасці заставаўся цяжкі і доўгі шлях. Беларусы прайшлі яго, і ў 1991-м на палітычнай карце свету з'явілася незалежная Рэспубліка Беларусь.

Падзеям XX стагоддзя будзе прысвечаная трэцяя частка кнігі «Айчына: маляўнічая гісторыя».

ГІСТАРЫЧНАЯ ВІКТАРЫНА

1. Чым праславіўся выпускнік Полацкай акадэміі Максімілян Рыла?
2. Хто такі Кароль Касцюшка-Валюжыніч? Якая ягоная знаходка прызнаная самай значнай?
3. Чаму Уладзіміру Спасовічу не дазволілі выдаць Статуты Вялікага Княства Літоўскага?
4. Якія мовы ведаў Каятан Касовіч? Якую заўвагу ён выказаў супрацоўнікам Брытанскага музея ў Лондане?
5. Хто такая Эліза Ажэшка?
6. За якое дасягненне Язэп Крашэўскі трапіў у Кнігу рэкордаў Гінеса?
7. Што вы ведаеце пра Юльяна Нямцэвіча?
8. Які французскі паэт паходзіць з нашых шляхецкіх родаў?
9. Чым знакаміты Фадзей (Тадэвуш) Булгарын?
10. Якія іншыя расейскія пісьменнікі маюць беларускае паходжанне?
11. Адкуль родам продкі нянькі Пушкіна Арыны Радзівонаўны?
12. Хто напісаў словы песні «В лесу родилась ёлочка»?
13. Чаму Уладзімір Спасовіч...
14. Хто склаў першы японска-расейскі слоўнік? Чым яшчэ адметны ягоны аўтар?
15. Чаму Восіп Кавалеўскі лічыцца заснавальнікам манголазнаўства?
16. Як завуць «бацьку якуцкай літаратуры»? Чаму яму далі такое найменне?
17. Які быў уклад беларусаў у тэатральнае мастацтва Расеі?
18. Што зрабілі нашы землякі для расейскага музычнага мастацтва?
19. Якія польскія кампазітары паходзяць з Беларусі?
20. За што мы шануем Івана Насовіча?
21. Кім мог бы стаць для свайго народа Канстанцін Ушынскі, каб у той час існавала беларуская дзяржава?

ПРЭМІІ

Новы фармат Нобелеўскай прэміі

Цырымонія ўручэння Нобелеўскай прэміі, якая павінна адбыцца ў снежні 2020 года, адбудзецца ў новым фармаце — праз абмежаванні, звязаныя з пандэміяй каронавіруса (COVID-19).



Пра гэта заявіў дырэктар Нобелеўскага фонду Ларс Хэйкенстан. «Нобелеўскі тыдзень не пройдзе, як звычайна, праз пандэмію. Кожны мусіць нечым ахвяраваць і прыстасоўвацца да цалкам новых абставінаў», — сказаў ён.


Хэйкенстан дадаў, што пераможцы будуць ушанараваны «па-іншаму», але не паведаміў дэталяў.

Падобнае здараецца ўпершыню з 1956 года, калі цудоўны Нобелеўскі банкет, які штогод ладзіцца з удзелам каля 1300 чалавек, у тым ліку членаў шведскай каралеўскай сям'і, будзе адменены.

Цырымонія ўзнагароджання ў Стакгольме і Осла 10 снежня таксама пройдзе ў «новых фарматах». Фонд падкрэсліў, што абвяшчэнне пераможцаў прадоўжыцца з 5 па 12 снежня.

Прэмія «PEN Pinter 2020»

Гэтай прэміяй быў адзначаны паэт і спявак Лінтан Квэсі Джонсан. Ён атрымае ўзнагароду ў часе інтэрнэт-цырымоніі, якая будзе арганізавана Брытанскай бібліятэкай 12 кастрычніка.



Лінтан Квэсі Джонсан — паэт, ікона рэгі (музычны стыль, які ўзнік у 1968 годзе на Ямайцы; яго характэрнай рысай з'яўляецца адсутнасць выключна рытмічных альбо выключна меладычных інструментальных партый).

Джонсан нарадзіўся 24 жніўня 1952 года на Ямайцы. Прыехаў у Лондан у 1963-м, вучыўся ў сярэдняй школе «Tulse Hill» і вывучаў сацыялогію ў Голдсмітскім каледжы, Лонданскім універсітэце.

«У сённяшніх умовах сістэмнай дэманізацыі імігрантаў і расавых меншасцяў у Вялікабрытаніі яго дзейнасць найактуальная», — адзначыў Макс Портэр, выдавец і адзін з «суддзяў» прэміі.

Сам Лінтан Квэсі Джонсан выказаўся пра падзею так: «Атрымаўшы ў 2013 годзе залатую ўзнагароду ад англійскага ПЭН-цэнтра, я са здзіўленнем даведаўся, што праз сем гадоў мне ўручылі прэмію «PEN Pinter». Узнагароды — на карысць кожнаму мастаку… Асабліва прыемна атрымаць узнагароду, якая ўшаноўвае памяць шаноўнага драматурга, Нобелеўскага лаўрэата Гаральда Пінтэра, вольнага мысляра, антыімперыяліста і праваабаронцы».

Прэмія «PEN Pinter» была заснавана ў 2009 годзе дабрачынным англійскім ПЭН-цэнтрам, які абараняе свабоду думкі. Прэмія ўручаецца штогод пісьменнікам, якія пражываюць у Вялікабрытаніі ці Ірландыі, тым, хто дэманструе «жорсткую інтэлектуальную рашучасць…каб вызначыць сапраўдную праўду нашага жыцця і нашага грамадства».

Падчас віртуальнай цырымоніі ў кастрычніку Лінтан Квэсі Джонсан абвесціць свайго пераможцу — «Міжнароднага пісьменніка мужнасці 2020 года», выбранага з міжнароднага шорт-ліста. Адрасатам стане пісьменнік, які актыўна абараняе свабоду слова, часта рызыкуючы ўласнай бяспекай і свабодай.

Прэміі Амерыканскага ПЭН-цэнтра

Амерыканскі ПЭН-цэнтр (PEN America) таксама назваў лаўрэатаў Літаратурных узнагарод «PEN America 2020».

З 1963 года літаратурнымі прэміямі Амерыканскі ПЭН-цэнтр адзначае «выдатныя галасы ў мастацкай літаратуры, паэзіі, навуцы, эсэістыцы, дзіцячай літаратуры, перакладзе і драматургіі». Пры падтрымцы партнёраў і прыхільнікаў у гэтым годзе Амерыканскі ПЭН-цэнтр уручыў амаль 20 розных узнагарод, стыпендый, грантаў і прызоў на агульную суму больш за 330 000 даляраў ЗША.

Сярод самых «грашавітых» узнагародаў — «PEN/Jean Stein Book Award» (75 000 даляраў), яе атрымала Yiyun Li за кнігу «Дзе прычыны канца»; «PEN/Nabokov Award» (50 000 даляраў) — за дасягненні ў галіне міжнароднай літаратуры, якой сёлета ўзнагародзілі M. Nourbese Philip; «PEN/Robert W. Bingham Prize» за зборнік дэбютных апавяданняў (25 000 даляраў), якую атрымала Mimi Lok; «PEN/Mike Nichols Writing» за наватарскія тэксты (25,000 даляраў) і «PEN/Diamonstein-Spielvogel Award» за кнігі па мастацтву і эсэ (10,000 даляраў).

Украінская прэмія імя Панаса Мірнага

Сёлета вызначаны лаўрэаты літаратурнай прэміі імя Панаса Мірнага.

У намінацыі «Літаратура, літаратуразнаўства» ім стаў Юрый Кацэгуб, пісьменнік, краязнаўца — за кнігі «Балбачан. Паміж двума пажарамі», «З Украінай у сэрцы, з мячом у руцэ»; Фелікс Штэйнсбук, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры рускіх даследаванняў і ўсходнееўрапейскіх даследаванняў Універсітэта Каменскага ў Браціславе, — за зборнік крытычных мініяцюрных нарысаў «Інкубацыя яек дыназаўраў».

У намінацыі «Журналістыка» перамагла Валянціна Філаненка, член Нацыянальнага саюза



журналістаў Украіны, паэтка, пераможца Нацыянальнага конкурсу «Украінская мова — мова адзінства».

Прэмія імя Панцеляймона Куліша

Прэстыжную літаратурна-мастацкую прэмію імя Панцеляймона Куліша нядаўна атрымала Віра Марушчак, старшыня Мікалаеўскай абласной арганізацыі Нацыянальнага саюза пісьменнікаў Украіны.

Міжнародная акадэмія літаратуры і мастацтва Украіны ўзнагародзіла пісьменніцу за кнігу прозы «Алфавіт жыцця» і наватарскія фармацыйныя дасягненні ў галіне мастацкай літаратуры.

Оскар Уайльд, турма і кнігі

Адным з апошніх прыпынкаў легендарнага брытанскага пісьменніка Оскара Уайльда перад выгнаннем стала яго любімая кнігарня. Пра гэты эпізод з жыцця літаратара згадваецца ў нядаўна выдадзенай кнізе Томаса Райта «Створаны з кніг: Як чытанне вызначыла жыццё Оскара Ўайльда».



Як адзначае аўтар кнігі, Уайльд у лісце з турмы прызнаваўся сваім сябрам, што адчувае страх «выйсці ў свет без адзінай кнігі». Было шмат прычынаў, па якіх эмацыйна траўмаваны сацыяльны ізгой мог пакутаваць, «але ў спісе пытанняў, якія стаялі перад Уайльдам, першымі былі кнігі, у якіх ён шукаў суцяшэння і надзеі».

Пасля таго, пісьменніка «за непрыстойныя паводзіны» асудзілі на два гады зняволення і папраўчых работы ў Рэдзінгскай турме, паспяховая пісьменніцкая кар'ера Уайльда завершылася, паколькі выкліканы гэтай справай скандал зрабіў яго персонай non grata ў прэтэнцыёзных велікасвецкіх колах, куды ён калісьці з лёгкасцю ўліўся.

У часе зняволення Уайльд па некалькі разоў перачытаў усе кнігі з турэмнай бібліятэкі, у тым ліку «Пекла (Боскую камедыю)» Дантэ. Таксама ён прасіў сяброў прысылаць яму творы Чосера, новую працу яго любімага аўтара і былога оксфардскага выкладчыка Ўолтара Пейтэра і п'есы драматургаў Елізавецінскай эпохі. Неўзабаве перад тым, як яго датэрмінова вызвалілі, Уайльд папрасіў сваіх блізкіх сяброў купіць для яго кнігі Гюстава Флабэра, Шарля Бадлера, Джона Кітса, Аляксандра Дзюма і Дантэ, пісьменніка, без якога ён проста не мог жыць.

Раніцай 19 траўня 1897 года Уайльд выйшаў за турэмную браму, дзе яго чакалі сябры — мастацтвазнаўца Мора Адэй і крытык Сцюарт Хэдлі. У таксі, едучы на вакзал, ён абмяркоўваў з сябрамі кнігі Дантэ.

Уайльд рыхтаваўся на некалькі гадоў адправіцца ў сумнае выгнанне за межы сваёй роднай краіны.


Ён прапусціў ранні параход у Д'еп на паўночным узбярэжжы Францыі, паколькі вырашыў зайсці ў сваю любімую кнігарню на Пікадзілі, 187, найстарэйшую лонданскую кніжную краму. Як напісаў у вышэйзгаданай кнізе Т. Райт, Уайльд «хацеў зрабіць некалькі хуткіх пакупак, апошніх на ангельскай зямлі». Аднак ён збег, калі адзін з пакупнікоў пазнаў яго ў краме і пачаў прыцягваць ўвагу іншых кліентаў.

Ноччу Уайльд перасёк Ла-Манш і спыніўся ў Д'епе, дзе яго сустрэлі сябры. Яны пасялілі яго ў гатэлі пад псеўданімам Себасцьян Мэлмот, што азначала «вандроўны пакутнік».

Калі Оскар Уайльд адчыніў дзверы ў свой пакой у гатэлі, то заплакаў. І не ад сваіх няшчасцяў, а з-за таго, што ён убачыў перад сабой: яо сябры падрыхтавалі яму букеты кветак і.. вялікі стос кніг.

Львоўскі форум выдаўцоў — у анлайн-фармаце

27-мы Львоўскі міжнародны форум выдаўцоў («BookForum 2020»), адзін з найбуйнейшых кніжных кірмашоў Еўропы, пройдзе ў анлайн-рэжыме. Мерапрыемства ў падобным фармаце адбудзецца ўпершыню.



16–20 верасня Львоўскі міжнародны форум выдаўцоў традыцыйна стане глабальнай пляцоўкай для абмеркавання важных культурна-грамадскіх тэм. Але ў 2020 годзе ён будзе не такім, «як заўсёды». Розніца з папярэднімі фестывалямі адна — мерапрыемства пройдзе віртуальна. Пра гэта паведамілі арганізатары на сваім сайце і старонцы ў Фэйсбук.

Тэма 27-ага «BookForum» — «Перапіс насельніцтва: ведаць, хто мы ёсць». Арганізатары хочуць звярнуць увагу на зменлівасць сучаснага свету і паказаць месца асобы ў гэтым свеце.

«Перапіс насельніцтва — гэта злучэнне сумленных пытанняў і сумленных лічбаў. Гэта магчымасць сказаць праўду пра сябе, якая нечакана будзе цікавая камусьці іншаму», — адзначыла куратарка праекта Ганна Улюра.

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы «Agence France-Presse», englishpen.org, pen.org, oblrada-pl.gov.ua, ukrinform.ua, «Literary Hub», «The Hill», novostiliterary.ru і telegraf.com.ua.

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: **(8-017) 354-80-91.** Адрас электроннай пошты: **sbp@tut.by**